Работніца і Калгасніца
Беларусі
№ 4 (149)
Люты
1932 г.

Рабселькоркі, прыміце актыўны ўдзел у масавым аглядзе барацьбы за аўладаньне тэхнікай сваёй справы

Гадавіна гістарычнай прамовы тав. Сталіна „аб аўладаньні тэхнікай“

Усім гаспадарчым, прафэсыянальным і камсамольскім арганізацыям, усім дабраахвотным тэхнічным таварыствам

Па ініцыятыве раду заводаў, саветаў навуковых таварыстваў і рэдакцый газэт гадавіна гістарычнай прамовы **тав. Сталіна** 4-га лютага **„аб аўладаньні тэхнікай“ адзначаецца правядзеньнем у лютым масавага агляду барацьбы за аўладаньне тэхнікай на прадпрыемствах.** Наркамат цяжкой прамысловасьці, УсеЦСПС, ЦК УсеЛКСМ і ўсесаюзнае таварыства „За аўладаньне тэхнікай“ прапануюць усім гаспадарчым, прафэсыянальным і камсамольскім арганізацыям безадкладна ўключыцца ў агляд і правесьці яго на працягу лютага пад кутом праверкі стану тэхпрапаганды і аўладаньня тэхнікай. Канкрэтна, у часе агляду неабходна праверыць:

1. Выкананьне дырэктывы ЦК УсеКП(б) ад 5 жніўня 1931 году аб тэхпрапагандзе і стварэньні масавай тэхнічнай грамадзкасьці („Ніто“, „Зот“, т-ва вынаходнікаў і г. д.).

2. Стан масавай тэхвучобы і тэхмасавай работы на прадпрыемствах.

3. Як увязваецца тэхпрапаганда з барацьбой за выкананьне прамфінпляну, павышэньне прадукцыйнасьці працы, паляпшэньне якасьці прадукцыі, вызваленьне ад чужаземнай залежнасьці ў тэхнічных адносінах.

> *„Задача, значыцца, заключаецца ў тым, каб нам самім аўладаць тэхнікай, самім стаць гаспадарамі справы. Толькі ў гэтым гарантыя таго, што нашы пляны будуць поўнасьцю выкананы, адзінаначальле будзе праведзена“.*
>
> *(З прамовы тав. Сталіна на ўсесаюзнай канфэрэнцыі гаспадарнікаў).*

Максымальнае скарыстаньне творчай ініцыятывы рабочых, спэцыялістаў, гаспадарнікаў.

4. Стан вучобы гаспадарнікаў без адрыву ад вытворчасьці.

5. Стварэньне тэхпляну на кожным прадпрыемстве. Агляд павінен выявіць, што зроблена па ўсіх гэтых напрамках на кожным паасобным вытворчым вучастку, падагуліць лепшы вопыт для перанясеньня яго на ўсе прадпрыемствы, намеціць канкрэтныя мерапрыемствы для далейшай работы і поўнасьцю ліквідаваць існуючую недаацэнку тэхпрапаганды з боку значнай часткі гаспадарчых органаў і прафсаюзаў.

Побач з агульнымі формамі правядзеньня масавага агляду (стварэньне праверачных брыгад, тэхпропаў, тэхканфэрэнцый, выставак, экскурсій, кіно і г. д.), а таксама масавай мабілізацыяй савецкай грамадзкасьці вакол агляду, нарком цяжкай прамысловасьці, УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ прапануюць:

1. Абвясьціць дзень 4 лютага ўсесаюзным днём тэхнікі і ў гэты дзень правесьці ва ўсіх прадпрыемствах спэцыяльныя сходы рабочых, прысьвечаныя агляду, з падвядзеньнем на іх гадавых вынікаў работы па аўладаньні тэхнікай.

2. Арганізацыя агляду павінна быць праведзена пры абавязковым захаваньні адзінства дзеяньняў усіх мясцовых арганізацый (тэхпропаў, гаспадарчых аб'яднаньняў і прадпрыемстваў, камсамольскіх арганізацый, прафорганаў „НІТО“, „ЗОТ“, таварыства вынаходцаў і г. д.) шляхам арганізацыі пастаянных нарад пры тэхпропах, гаспадарчых аб'яднаньнях і прадпрыемствах.

3. Вынікі работы па агляду неабходна абгаварыць на масавых тэхнічных канфэрэнцыях, якія арганізуюцца ў агульна-заводзкім і раённым маштабе, на якіх павінны быць асабліва пад'агулены наступныя асноўныя паказальнікі:

а) кантрольныя лічбы ахопу ўсімі відамі масавай тэхвучобы розных катэгорый і кваліфікацый рабочых, ІТР і служачых на 1932 год;

б) складаньне адзінага пляну масавай кампаніі тэхпрапаганды;

в) выпуск тэхнічнай пазыкі вучобы па лініі ІТР і рабочых;

г) плян арганізацыі тэхнічных таварыстваў.

За бальшавіцкія тэмпы ў масавай тэхпрапагандзе!

Нарком цяжкай прамысловасьці СССР
С. Арджанікідзэ.

Сакратар УсеЦСПС **Н. Швэрнік**

Сакратар ЦК УсеЛКСМ **А Косараў.**

Усесаюзнае таварыства „За аўладаньне тэхнікай“.

Зіна Шасьцітка, разборшчыца друкарні імя Сталіна (Менск). Прэміявана як лепшая ўдарніца. У дзень ударніка падала заяву ў камсамол.

„Апублікаваныя тэзісы аб другой пяцігодцы з выключнай сілай сьведчаць аб тым, што партыя Леніна пераможна вядзе нашу краіну да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Мы ідзем наперад, перамагаючы ўсе труднасьці, якія стаяць на нашым шляху. Мы будуем і пабудуем у канцы другой пяцігодкі, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і правадыра партыі тав. Сталіна, сацыялізм, пабудуем, наперакор супраціўленьню апартуністаў, новае бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва".

(ГІКАЛО).

т. Гікало—першы сакратар ЦК КП(б)Б

XIV Зьезд камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі

З прамовы першага сакратара ЦК КП(б)Б т. Гікало

XIV зьезд партыі (бальшавікоў) Беларусі сабраўся сёньня тут для таго, каб падвесьці вынікі работы, праробленай за паўтары гады, намеціць далейшыя практычныя шляхі бальшавіцкага наступленьня на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Тав. **Шаранговіч** у сваім дакладзе з поўнай вычарпальнасьцю спыніўся на тых вялікіх дасягненьнях, якіх дабілася КП(б)Б у сваёй рабоце.

Сёньня, калі кожны з дэлегатаў, адзначаючы наяўныя дасягненьні, ставіць пытаньне аб новых задачах, што ўзьнікаюць ня толькі перад партыйнай арганізацыяй у цэлым, але перад кожным камуністам, кожным рабочым, мы павінны азірнуцца назад, яшчэ раз падлічыць, бегла праглядзець праробленую за гэты час работу для таго, каб яшчэ больш яснымі былі для нас шляхі далейшага будаўніцтва сацыялізму.

Зразумела, што, уступаючы ў пэрыяд сацыялізму з нябывалымі ў гісторыі посьпехамі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, мы ня можам прайсьці міма тых вялікіх труднасьцяй, якія прадстаяць нам у нашай будучай рабоце.

Кожны камуніст, кожны камсамолец, кожны рабочы разумее, што калі мы сёньня гаворым аб тым, што мы з посьпехам прайшлі вялізарнейшай труднасьці этап, этап завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне, то яшчэ большыя труднасьці, а адсюль і патрабаваньні яшчэ большай актыўнасьці становяцца перад кожным камуністам, перад кожным камсамольцам, перад усімі працоўнымі нашай краіны ў новых баёх, у новых работах, што прадстаяць.

Вядома, сёньня, калі мы прарабілі вялікую работу, калі ўвесь Савецкі Саюз, уся партыя падагульвае вынікі бліскучых перамог, сёньня-ж кожны камуніст і камсамолец павінны задумацца над тэй грандыёзнай работай, якая прадстаіць яму заўтра.

І сапраўды. Апублікаваныя ўчора дырэктывы ЦК партыі аб другой пяцігодцы, апублікаваныя сёньня тэзісы аб выніках разьвіцьця прамысловасьці за 1931 г. і задачах на 1932 г. ставяць перад усёй нашай партыяй сусьветна-гістарычнай важнасьці пытаньні аб ліквідацыі ў Савецкім Саюзе клясаў у другой пяцігодцы, аб пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Калі з такой сілай, з такой імклівасьцю партыя ставіць гэтыя вялізарнейшага значэньня задачы,— то гэта азначае, што ў Савецкім Саюзе рабочая кляса стала найвялікшай сілай, цьвярдыняй, якая ліквідуе клясы, упэўнена будуе сацыялістычнае грамадзтва.

Гэтыя гістарычнага і сусьветнага значэньня пастановы ЦК партыі вынікаюць з усёй папярэдняй работы ЦК нашай партыі. Калі мы сёньня маем вялізарнейшыя посьпехі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, калі мы з краіны, якая некалькі год таму назад была выключна адсталай, ператварыліся сёньня ў перадавую краіну, калі мы сёньня маем магутную, непераможную Чырвоную армію, дык усё гэта стала магчымым у рэзультаце ленінскага кіраўніцтва нашага ЦК партыі, які вядзе краіну, рабочую клясу, партыю да гэтых вялізарнейшых перамог.

Таварышы, мы, прыступаючы да работы па ажыцьцяўленьні задач 1932 г., павінны ведаць, што 1931 г. зьявіўся годам, калі ўся партыя, уся рабочая кляса, калгасьнікі і працоўныя даказалі сваё ўменьне будаваць сацыялізм. Яны паказалі ўменьне будаваць сацыялізм пад кіраўніцтвам ЦК партыі тым, што практычна, апэрацыйна, уваходзячы ў сутнасьць кожнага маленькага пытаньня, здолелі вырашыць найскладанейшыя, важнейшыя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва. Так працаваць вучыў нас Цэнтральны Камітэт партыі, гэтаму нас вучыў правадыр партыі, правадыр сусьветнага пралетарыяту тав. Сталін.

Праглядаючы пастановы ЦК партыі за 1931 г., можна бачыць, што па вялізарнейшай важнасьці пытаньнях ЦК партыі выносіў зусім канкрэтныя апэрацыйныя пастановы. Вазьмеце пастанову ЦК партыі па пытаньнях транспарту, вугалю, сельскай гаспадаркі, каапэрацыі, машынабудаўніцтва, па любым пытаньні,—вы бачыце, што пастановы Цэнтральнага Камітэту партыі зусім выразна ставяць канкрэтныя баявыя задачы і мабілізуюць партыю і рабочыя масы вакол вузлавых пытаньняў нашага будаўніцтва.

Відавочна, кожны з дэлегатаў зьезду чытаў гістарычную пастанову ЦК партыі аб другой пяцігодцы. У пастановах і дырэктывах па другой пяцігодцы зусім выразна і ясна гаворыцца, што рэзультаты работы за першыя тры гады пяцігодкі, воля рабочай клясы, арганізуючы пачатак нашай партыі зьяўляецца тэй асновай, якая дазваляе ў другой пяцігодцы прыступіць да ажыцьцяўленьня вялізарнейшай палітычнай задачы—ліквідацыі клясаў. Так, у 1931 годзе, ня гледзячы ні на якія гутаркі апартуністаў усіх масьцей, ствараўся, будаваўся фундамант сацыялістычнай эканомікі, так, у бязьлітаснай барацьбе з правым і „левым“ апартунізмам, кожная партыйная арганізацыя, незалежна ад таго, дзе-б яна не знаходзілася—у Беларусі, у Маскоўскай вобласьці, у Ленінградзе, ці ў другіх частках Савецкага Саюзу, падыходзіла па-дзелавому, канцэнтравана, не раскідаючы сілы да ажыцьцяўленьня тых вялізарнейшых задач, якія былі пастаўлены ў першай пяцігодцы і ў прыватнасьці ў трэцім рашаючым годзе.

Так нас вучыў працаваць Цэнтральны Камітэт партыі, так вучыў нас працаваць правадыр партыі тав. Сталін.

Таварышы, толькі таму, што кожны камуніст, кожны бальшавік на кожным вучастку сваёй работы меў яснае прадстаўленьне аб канкрэтных задачах, пастаўленых партыяй і пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК непрымірыма змагаўся разам са сваёй бальшавіцкай партыяй супроць усякага праяўленьня апартунізму, супроць правых, супроць „левых“, супроць прымірэнцтва, за генэральную лінію партыі, ажыцьцяўляючы практычна гэту лінію, толькі ў рэзультаце ўсяго гэтага мы змаглі атрымаць найвялікшыя перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Днепрабуд. Быкі плаціны сярэдняга пратоку

Тав. Шаранговіч у сваім дакладзе ўжо разгарнуў малюнак вялікай работы, праробленай беларускай партыйнай арганізацыяй. Вы маеце бязумоўна тут таксама, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, цэлы рад буйнейшых посьпехаў. Партыйная арганізацыя Беларусі за гэты час не на словах, а на справе змагалася за генэральную лінію партыі і непахісна праводзіла гэтую лінію ў жыцьцё.

Больш таго, беларуская партыйная арганізацыя змагла на справе перамагчы тыя труднасьці, перамагчы тыя хістаньні, якія сустракаліся ў яе радох. Беларуская партыйная арганізацыя правяла вялікую работу па выкрыцьці нацыянал-дэмакратаў, яна змагла выкрыць, выявіць і разграміць нацыянал-дэмакратаў і іх агентаў у радох партыі—нацыянал-апартуністаў. Кіруючыя кадры КП(б)Б на аснове барацьбы за бальшавізм, за ленінізм супроць нацыянал-дэмакратаў, супроць хістаньняў і ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, супроць апартуністычных установак змаглі прывесьці партыйную арганізацыю Беларусі да сур'ёзных перамог.

Побач з гэтым у беларускай арганізацыі ёсьць цэлы рад буйных недахопаў у рабоце. Аб іх тав. Шаранговіч гаварыў. Ён паказваў на невыстарчальную работу па выкананьні прамысловасьцю прамфінпляну.

Зусім ясна, што калі прамысловасьць Беларусі выконвае прамфінплян на 80 проц., то гэта бязумоўна нездавальняюча. Калі плян загатовак, у прыватнасьці па ільне, мясе, выконваецца нездавальняюча, гэта таксама сур'ёзьнейшы недахоп. Гэта гаворыць аб цэлым радзе хібаў, гэта гаворыць аб тым, што на некаторых вучастках нашай работы тут, у Беларусі, мы маем невыстарчальную раскачку, што ёсьць яшчэ бязумоўна рад недахопаў у галіне канкрэтызацыі кіраўніцтва.

Таварышы, у чэрвені, выступаючы на нарадзе гаспадарнікаў, тав. Сталін паставіў рад важнейшых гістарычных задач у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, у барацьбе за пабудову сацыялізму ў нашай краіне. Шэсьць гістарычных указаньняў тав. Сталіна зьяўляюцца тэй асноўнай умовай, на аснове якой можна дабіцца санраўднага выкананьня прамфінпляну, сапраўднага павароту ў рабоце.

Таварышы, сёньня, калі расьце рабочая кляса калі расьце партыя і паасобныя партыйныя арганізацыі, толькі адна беларуская арганізацыя за паўтары гады выросла на 17.000 чалавек, калі рабочая кляса, у прыватнасьці Беларусі, выросла значна за лік новых рабочых, за лік выхадцаў з вёскі, за лік у пэўнай меры элемэнтаў дробнай буржуазіі ў горадзе, калі расьце культурны ўзровень і актыўнасьць рабочай клясы,—пытаньні масавай работы, пытаньні быту рабочай клясы, аб гэтым ужо гаварыў тав. Шаранговіч, набываюць важнейшае значэньне.

Вядома, і беларуская партыйная арганізацыя мае вялікія дасягненьні ў справе снабжэньня, у справе паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых мас—рост зарплаты, рост культуры і цэлы рад іншых паказальнікаў, якія сьведчаць аб росьце, аб значным прасоўваньні наперад. Але, калі сёньня прамфінплян у цэлым выконваецца на 80 проц., а паасобнымі прадпрыемствамі — на 50—60 проц., дык гэта сьведчыць аб сур'ёзных недахопах. Гэта гаворыць аб тым, што сюды павінна быць накіравана наша ўвага.

Бальшавікі Беларусі, кіраўніцтва беларускай партарганізацыі паказалі, што яны могуць змагацца за ленінскую нацыянальную палітыку. Кіраўніцтва беларускай партарганізацыі правяло сапраўды бальшавіцкую барацьбу з нацыянал-дэмакратамі.

Тав. Сталін на XVI зьезьдзе нашай партыі з вычарпальнай яснасьцю ўказаў на неабходнасьць рашучай барацьбы як з вялікарускім шавінізмам, так і з праяўленьнямі мясцовага нацыяналізму. Але ў той-жа час тав. Сталін і пастановы XVI партзьезду падкрэсьлілі, што галоўнай небясьпекай у галіне нацыянальнага пытаньня зьяўляецца ўхіл да вялікарускага шавінізму.

Гэтай ленінскай бальшавіцкай установкай павінна быць пранізана ўся наша работа. Партыйная арганізацыя Беларусі павінна мабілізаваць усе свае сілы на барацьбу з ухілам да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай, не аслабляючы барацьбы з ухілам у бок мясцовага нацыяналізму. Усякі, хто ставіць пытаньне інакш, ідзе супроць палітыкі партыі ў нацыянальным пытаньні.

Зразумела, у правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі сутнасьць заключаецца ня ў тым, каб абмежавацца фразамі, каб ухваліць толькі рэзалюцыі, у якіх адзначыць ухіл да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі. Справа ня ў гэтым. Справа, вядома, ня ў фразах, не ў рэзалюцыях, а ў бальшавіцкім змаганьні з ухіламі ў нацыянальным пытаньні і прымірэнцтвам да іх, і ў практычным ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Беларуская арганізацыя паказала, што яна сапраўды ўмее і гэта пытаньне ставіць і вырашаць правільна.

Няма ніякіх сумненьняў у тым, што кіраўніцтва беларускай партарганізацыі і ў далейшым здолее забясьпечыць правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі так, як гэтага патрабуе партыя, як гэтага патрабуюць інтарэсы рабочай клясы, як гэтага патрабуе будаўніцтва сацыялізму ў Беларускай ССР.

Сваячасова паклапаціцца аб падрыхтоўцы дашкольных кадраў

Савецкая Беларусь—адна з першых рэспублік СССР уводзіць усеагульнае дашкольнае выхаваньне ў гэтым годзе з 100 проц. ахопам дзяцей рабочых, калгасьнікаў—раёнаў суцэльнай калектывізацыі і раёнаў асобнай важнасьці, і 50 проц. дзяцей дашкольнага ўзросту ўсяго працоўнага насельніцтва. Гэта значыць, што нам у гэтым годзе патрэбна будзе арганізаваць 7.225 дашкольных устаноў, з іх 4.720 летніх пляцовак, якімі трэба ахапіць 316 тысяч дзяцей.

Для абслугоўваньня сеткі дашкольных устаноў патрэбна 9.225 чалавек, 7.200 з іх неабходна падрыхтаваць. Справа падрыхтоўкі такой вялікай колькасьці дашкольных працаўнікоў зьяўляецца справай ня толькі органаў нарасьветы, а таксама справай прафсаюзных, калгасных, гаспадарчых, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый. З 15-га лютага 1932 г. у кожным раёне арганізоўваюцца 3-месячныя курсы па падрыхтоўцы дашкольных працаўнікоў, выходзячы з неабходнай колькасьці працаўнікоў для кожнага раёну.

Кожны раён павінен абавязкова выканаць кантрольныя лічбы па падрыхтоўцы кадраў. Так, Касьцюковіцкі раён суцэльнай калектывізацыі павінен падрыхтаваць 310 асоб, Лёзьнянскі—220 асоб, Гарадоцкі—166, Асьвейскі—75 асоб, Чэрыкаўскі—150, Койданаўскі—160, Клімавіцкі—220. Апрача таго, арганізоўваюцца куставыя курсы па падрыхтоўцы дашкольных працаўнікоў для забесьпячэньня дашкольных устаноў нацменшасьцяй на іх мове.

Дэлегаткі, актывісткі фабрык, саўгасаў, калгасах павінны дабівацца вылучэньня лепшых ударніц на гэтыя курсы. Пасьпяховае выкананьне падрыхтоўкі кадраў зьяўляецца выкананьнем аднэй з умоў тав. Сталіна.

У гэтым годзе на дашкольную справу асыгнавана ў 2½ разы больш сродкаў, чымся ў мінулым годзе. Замест 1.816.700 руб. у 1931 г. асыгнавана 4.943 300 руб. Аднак, для забесьпячэньня ўзятых тэмпаў па разгортваньні дашкольнага выхаваньня сродкаў, якія адпускаюцца дзяржавай, ня хопіць. **Неабходна максымальна прыцягнуць сродкі грамадзкасьці** (фубр, каапсаюз, сампрамсаюз, райкалгассаюз).

Толькі мабілізацыяй увагі пралетарскай грамадзкасьці вакол пытаньняў усеагульнага дашкольнага выхаваньня забясьпечым выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб дашкольным выхаваньні.

Бляхэр, Ходырава.



Сельмашстрой, г. Ташкент. Жалеза-бэтонны і ліцейны цэх.

РНБ Ср.-Аз.

ВЫВУЧЫЦЬ ТЭХНІКУ,

„Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай. Пара бальшавікам самім стаць спэцыялістамі. Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі рашае ўсё, і гаспадарнік, які не жадае вывучаць тэхніку, які не жадае аўладаць тэхнікай, гэта анэкдот, а не гаспадарнік".

(З прамовы тав. Сталіна на ўсесаюзнай канфэрэнцыі гаспадарнікаў).

93 тысячы эканомії

Шчотачная фабрыка (гор. Менск) да гадавіны прамовы тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай падвяла вынікі сваёй рацыяналізатарскай працы і тэхнічнай вучобы.

Фабрыка мае дасягненьні ў галіне рацыяналізацыі. Добрыя вынікі дала пазыка ідэй (пазыка рацыянал затарскіх прапаноў), якая фабрыкай была праведзена па прыкладзе „Электразаводу".

За адзін 1931 год паступіла 275 рабочых прапаноў, у той час, калі за ўвесь час існаваньня фабрыкі, пачынаючы за 1923 году па 1930 г., было ўсяго 160 прапаноў, якія далі эканомії ф-цы 1.300 руб.

З 275 рабочых прапаноў праведзена ў жыцьцё 185. За адзін 1931 год гэтыя **185 рабочых прапаноў далі эканомії 93.000 руб.**

Рабочым і работніцам—вынаходцам і рацыяналізатарам выплачана 7.500 руб. Прэміі выдаваліся часткай грашыма, 6 чалавек пасланы ў дамы адпачынку, 10 чал. у экскурсіі на поўдзень—Крым, Каўказ, у прамысловыя цэнтры Саюзу і інш.

Ужо пабудавана абразальная машына для фанэры—вынаходка рабочага Міклашэўскага і машына для чоскі воласу—вынаходка рабочага Несьвіскага і інш.

Работніца Янушэўская ўнесла тры рацыяналізатарскіх прапановы, за што атрымала 10 руб. прэміі і пазыку ідэй.



Окунь—ударніца наборнага цэху шчотачнай ф-кі.

Пэўзьнер—ударніца шчотачнай ф-кі.

Зараз фабрыка рыхтуецца да другога тыражу пазыкі ідэй.

Па гэтым пытаньні праведзена нарада актыву ф-кі і мітынгі па цэхах.

За адзін дзень 27-1 32 г. паступіла рабочых прапаноў па буравачным—4, па кістачным—3, па аддзелачным—3, па валасяным—2.

Партарганізацыя ф-кі ўзначальвае і кіруе ўсёй гэтай працай.

На 1932 год намечан шырокі плян рацыяналізатарскай працы. Арыентовачна паводле пляну намечана атрымаць эканомії па рацыяналізацыі 78.456 руб. 56 к.

Да гэтага часу на фабрыцы працаваў толькі адзін гурток па аўладаньні тэхнікай—гурток нармоўшчыкаў, у ліку слухачоў якога было 5 работніц.

У першы квартал мяркуюць распачаць працу гуркі: чарцёжны, па аўладаньні тэхнікай наборных машын і сьлясарны.

З першага студзеня на фабрыцы абвешчан штурм па якасьці прадукцыі. Па кожным працэсе і варштаце ІТР распрацоўвае пастаянныя інструкцыі, якія будуць прапрацаваны на рабочых сходах і пасьля гэтага ўведзены.

На фабрыцы ёсьць 35 брыгад, пераведзеных на гаспадарчы разрахунак з лікам ударнікаў у 215 чалавек, якія далі дадатковую эканомію 10.338 руб., з іх рабочым выплачана 1.533 руб.

Пад кіраўніцтвам парткалектыву рабочыя і работніцы шчотачнай фабрыкі па-бальшавіцку змагаюцца за сапраўднае ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў т. Сталіна.

В. Б.

„Самае важнае з пункту гледжаньня будаўніцтва мы ўжо зрабілі. Нам засталося нямнога. Вывучыць тэхніку і аўладаць навукай. Калі мы зробім гэта, тады ў нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы не адважваемся і марыць".

(З прамовы т. Сталіна на ўсесаюзнай канфэрэнцыі гаспадарнікаў).

АЎЛАДАЦЬ НАВУКАЙ

Рабочыя і работніцы ф-кі „Кастрычнік“ у барацьбе за тэхніку

Фабрыка „Кастрычнік“ з саматужнай, невялікай, у 300 чалавек у 1928 годзе выраслa ў буйное тэхнічна-абсталяванае прадпрыемства, якое мае 1694 рабочых. З іх 999 жанчын.

На фабрыку прышлі новыя пласты рабочых і работніц. Большасьць з іх—гэта былыя саматужнікі. Але ёсьць і такія, што да прыходу на фабрыку зусім ня былі знаёмы са швэйнай прамысловасьцю. Новая тэхніка—дэтальны падзел працы (шыцьцё аднаго паліта падзяляецца на 96—105 апэрацый)—дае магчымасьць ім працаваць. Але-ж праца больш прадукцыйная і дае лепшы эфэкт, калі рабочы і работніца аўладаюць тэхнікай швэйнай прамысловасьці.

Фабрыкай намечан рад мерапрыемстваў, якія дапамогуць рабочым аўладаць тэхнікай швэйнай прамысловасьці.

Праводзяцца шасьцімесячныя курсы тэхнічнага пэрсаналу фабрыкі для павышэньня іх ведаў. Нізавы фабрычны друк рыхтуецца да партыйна-тэхнічнай фабрычнай канфэрэнцыі, зьбіраюцца прапановы па пытаньні наладжаньня працы, па аўладаньні тэхнікай.

Фабрычны друк уключыўся ў пераклічку нізавога фабрычнага друку швэйнай прамысловасьці БССР па пытаньні аўладаньня тэхнікай.

Фабрычнае кіраўніцтва прыняло захады, каб вызваліцца ад замежнай залежнасьці ў сэнсе тэхнічнага абсталяваньня, і зараз ў майстэрні фабрыкі робяцца дэталі для машын, якія раней прывозіліся з-за мяжы, а таксама рэзальныя машыны, за якія раней прыходзілася плаціць валютай.

Б.

Брыгада тав. Юспы

Наборны цэх шчотачнай фабрыкі (гор. Менск) у параўнаньні з другімі цэхамі—вялікі. Каля 300 работніц сядзяць за доўгімі сталамі. У цэху цішыня. Мільгаюць рукі, зацягваючы волас у калодкі, у такт рухам рук рытмічна раскачваецца ўсё цела.

Стол, за якім працуе брыгада тав. Юспы, стаіць з краю.

Дванаццаць маладых дзяўчат сядзяць за сталом. У бакі пазіраць няма калі.

Толькі часамі тав. Юспа скажа: „Ну, ну, дзяўчаткі, мы-ж павінны быць прыкладам“.

І сапраўды гэта брыгада зьяўляецца лепшай. Яна першай перайшла на гаспадарчы разрахунак. Было гэта тры месяцы таму назад. Брыгада назвалася фізкультурнай гаспадарча-разрахунковай брыгадай, бо большасьць дзяўчат з брыгады зьяўляюцца заўзятымі фізкультурніцамі.

Першы месяц працы паказаў добрыя вынікі гаспадарчага разрахунку. Брыгада штомесячна перавыконвае прамфінплян.

Кожны месяц работніцы атрымліваюць прэмію за эканомію. За верасень брыгада атрымала 78 р. 40 к., за кастр 27 р. 80 к., за лістапад 25 р. 48 к., за сьнежань 30 р. 16 к.

Гаспадарчы разрахунак прымусіў работніц пільна сачыць за выдаткаваньнем сырцу — воласу і дроту.

Работніца Трушко ў часе абедзенага перапынку нагнулася каля стала і чысьценька пазьбірала з падлогі раскіданы волас.

Тав. Завалкіна, р-ца запалкавай ф-кі „Вэзуві“, член ЦВК БССР.

ГПБ Сл.-18.

Валасок да валаска складвае яго. Сама яна гаворыць—хіба-ж я раней так зьбірала-б, гэта-ж усё пашло-б у сьмецьце, а зараз не, так ня можна—гэта наша эканомія. Кожны невялічкі кавалачак дроту скарыстоўваецца, а раней ён выкідваўся. Брыгада дае добрую якасьць працы.

Пытаньне якасьці брыгада абгаварыла на сваім сходзе. Работніца **Куноўская прэміявана за лепшую якасьць.**

У часе прэміяваньня лепшых ударніц ф-кі **з брыгады Юспы прэміявана 5 чалавек: Ляшынская, Коцава, Юспа, Куноўская, Трушко.**

Юспа старшая ў брыгадзе. Яна працуе 6 гадзін, а ня 8, ёй толькі 17 год. Яна тры тыдні таму назад стала камсамолкай. За свае 6 гадзін яна норму ў 26 шчотак перавыконвае. Кожны дзень робіць 28—29. Рэшта дзяўчат-работніц робяць за дзень 36—38 кожная.

Брыгада ўся, як адзін, падпісалася на часопіс „Работніца і калгасьніца Беларусі“ на цэлы год і выклікала на сацспаборніцтва ўсе іншыя брыгады свайго цэху.

Пераймаючы добры прыклад працы брыгады тав. Юспы, і іншыя брыгады пачалі пераходзіць на гаспадарчы разрахунак. Зараз на фабрыцы 35 гаспадарча-разрахунковых брыгад.

В.

Наладзіць тэхнічную вучобу

(Менская тэкстыльная ф-ка)

Тэхнічная вучоба ў нас яшчэ не наладжана, няма тэхнічных гурткоў. Ст расты гурткоў ёсьць, але гурткоў ня склікаюць. Калі іх пытаюць, чаму яны ня зьбіраюць работніц на вучобу, яны гавораць, што ўсе заняты, няма як іх зьбіраць.

Калі-б работніцы займаліся тэхвучобай, яны-б сталі больш ці менш кваліфікаванымі і якасьць прадукцыі магла-б палепшыцца, а то якасьць у нас кульгае. Задача вытворчага сэктару арганізаваць гурткі тэхнічнай вучобы, дабіцца таго, каб іх добра наведвалі. Гэта дапаможа паляпшэньню якасьці работы на нашай фабрыцы.

Работніца.

ПУСКАЛЁВА ХІМА—ЛЕПШАЯ СЬВІНАРКА

Упяршыню зьбіралі сьвінарак буйнейшых калгасаў Аршанскага раёну на нараду, ды дрэнна падрыхтаваліся, таму і зьявілася толькі 9 сьвінарак, з якіх 3 з саўгасаў.

Тыя, што сабраліся, падзялілі вопытам сваёй працы. З якою любасьцю расказвае аб сваіх парасятах лепшая ўдарніца саўгасу „Вусьце", Яромкаўскага сельсавету—**Пускалёва Хіма.**

Хіма—гэта гонар раёну і асабліва саўгасу „Вусьце".

„Усяго яна дабівалася для сваіх парасят,—кажа намесьнік дырэктара саўгасу,—спытаецца ў зоотэхніка, колькі і чаго патрэбна для іх і, калі старшая сьвінарка ёй гэтага не адпусьціць, пойдзе да дырэктара і дабʻецца, каб парасяты атрымалі патрэбныя ім харчы. А ў сьвінарнік яе зайсьці была любата. Усюды чыста, парасяты таксама чыстыя, бо 2 разы ў дзень мыла іх Хіма ўлетку".

Ужо амаль два гады працуе Хіма на сьвінарніку. Даглядала 194 парасят адна. У той дзень, калі яна была выходная, яе замянялі ўдваіх. **Хіма прэміявана саўгасам 50 руб. і мануфактурай.**

Калі Хіма захварэла і яе замянялі другія, не пазнаць стала сьвінарніка. Стала брудна, павялічыўся адыход. Цяпер Хіма зноў узялася за працу і наводзіць парадкі. Хіму любяць і паважаюць у саўгасе.

Сьвінаркі ў большасьці гаварылі, што цяжка яшчэ ім працаваць, бо няма належнай увагі да сьвінарак з боку праўленьняў. Таму часта яны мяняюцца.

— Ледзь ня кожную пяціднёўку ці дзесяціднёўку мяняюцца ў нашым сьвінарніку сьвінаркі—паведамляе **Жарава** з калгасу „Ленінскі шлях".—Я ўжо 3-ці год у калгасе, год працую на сьвінарніку. Даглядаю 18 матак, 15 парасят і 1 кныра. Часта мяняюцца ў нас і людзі ля катла. Я раней парыла 20 чыгуноў бульбы і карміла 50 сьвіней. Цяжка было, але спраўлялася. Спэцвопраткі набыць няма дзе. Аднак, дабілася я, што з 16 парасят, якія ў мяне былі, 15 гадуюцца.

Дрэнны догляд сьвіней прывёў у радзе калгасаў да вялікага адыходу. У камуне „Кашыно", Межынскага сельсавету, з 130 сьвіней засталося толькі 30. Вялікі адыход быў і ў калгасе „Чырвоная зорка", Тумянецкага сельсавету. Сьвінаркі **Анкіновіч** і **Завадзкая**, якія расказвалі аб вялікім адыходзе і ў іх калгасах, нават добра ня ведаюць, у чым прычына гэтага. Ніхто з імі ніколі не абгаворваў гэтага, ніхто ня зьбірае і ня вучыць, як рабіць, каб ня было такога агіднейшага зьявішча ў калгасах, якое там наглядаецца.



Карова мясцовай палепшанай беларускай пароды. Удой 25 літраў у дзень.

Толькі **у саўгасах „Вязынь" і „Бабінічы" больш-менш акуратна працуюць тэхнічныя гурткі сьвінарак, якімі кіруюць зоотэхнікі. Бываюць і вытворчыя нарады сьвінарак.**

Змагацца за аўладаньне тэхнікай сваёй справы, за 100 проц. захаваньне маладняка, за тону мяса з 6-месячнага апаросу—баявая задача сьвінарак.

Наладзіць работу вытворчых нарад сьвінарак—абавязак калгасных арганізацый. М—я.

Насьценгазэта дапамагла

Раней у калгасе „Чырвоны маяк", Мусіцкага сельсавету, Слуцкага раёну, на сьвіной фэрме быў рад недахопаў. Работа ня была праведзена на зьдзельшчыну, у сьвінарніку было мокра, сьвіньні стаялі напалову ў брудзе.

Зараз, калі па ініцыятыве райгазэты „Ленінскі шлях" наладжан штодзенны выпуск насьценгазэты, справа палепшылася. Уся работа ў калгасе (у тым ліку і на СТФ) праведзена на прэміяльна-зьдзельную сыстэму, сьвіньні сваячасова падсьцілаюцца і добра даглядаюцца. З сьвінарак арганізавана ўдарная брыгада. Сьвінаркі замацавалі сябе на працы ў СТФ на працягу 3-х год і абавязаліся зьнізіць адыход маладняка на 20 проц. (а да гэтага часу адыход дасягаў каля 50 проц.) і даць на працягу 6-ці месяцаў тону мяса ад аднаго апаросу. Уся работа праводзіцца мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на аснове ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна. Лепшыя прыклады працы паказваюць сьвінаркі-ўдарніцы: Васілевіч Натальля, Савіч Марыля, Бранавец Волька і Высоцкая Поля. **А. Шпакоўскі.**

Працаваць па-новаму, г. зн., што трэба не на словах, а сапраўды на справе праводзіць генэральную лінію партыі, што працаваць па-новаму—гэта значыць трэба павысіць тэмпы сваёй работы, што працаваць па-новаму—гэта перш за ўсё трэба паглядзець на якасьць работы, што працаваць па-новаму—гэта значыць увайсьці ў сутнасьць справы, гэта значыць аўладаць тэхнікай, гэта значыць, што калі сёньня вырашаецца пытаньне аб вытворчасьці, то асновы гэтай вытворчасьці павінны быць вам вядомы і вамі вывучаны. Калі вы абмяркоўваеце пытаньне аб сельскай гаспадарцы, аб тым-жа ільне, то вы павінны аўладаць тэхнікай вытворчасьці гэтага ільну.

Працаваць па-новаму, гэта значыць, працаваць не наогул, а канкрэтна, разглядаючы кожнае паасобнае канкрэтнае пытаньне, працаваць па-новаму, гэта значыць, апэрацыйна працаваць, а працаваць апэрацыйна—гэта перш за ўсё значыць кіраваць не з габінэту, а бываць на мясцох, бачыць жыцьцё вачыма бальшавіка. Калі сёньня нам скажуць, што работа па грамадзкім харчаваньні стаіць добра, мы ня можам паверыць да таго часу, пакуль сваімі вачыма бальшавікоў не паглядзім і не праверым.

Значыць, работа па-новаму мае на ўвазе праверку на месцы, гэта значыць праверку выкананьня. Вось што азначае працаваць па-новаму. Работа па-новаму азначае, каб працаваць ня замкнута, не ізалявана, а на аснове разгорнутай пралетарскай унутрыпартыйнай самакрытыкі. Гэта значыць, што трэба ў рабоце праводзіць прынцыповасьць, а не бясprынцыпнасьць. Гэта азначае, што трэба змагацца з фразай, з гаварыльняй.

Вось што азначае, таварышы, працаваць па-новаму".

(*ГІКАЛО*).

Рашуча ачысьціць калгасы ад чуждых элемэнтаў

Выгнаць з праўленьня апартуністаў

Калгас імя X зьезду (Сеньніцкі сельсавет, прыгараднага раёну) мае вялікую запазычанасьць дзяржаве. Плян загатоввк ня выканан. **На пляне збожжа дана 120 п., здана толькі 40 п. Збожжа і бульбу калгасьнікі возяць на прыватны рынак, а загатоўкі ня выконваюцца.**

Азіміна ў калгасе ня была аграмаджана, і кожны калгасьнік сам убраў сваё ва ўласнае гумно. Плян загатовак, даведзены да калгасу, быў раскладзен па дварох калгасьнікаў. Для гэтага была вылучана спэцыяльная камісія, у якую ўвайшлі члены праўленьня. Самі члены камісіі Жоглін і Ягіроўскі сваю запазычанасьць не ліквідуюць, па іх раўняюцца іншыя калгасьнікі.

Праўленьне ў цэлым не мабілізуе масы калгасьнікаў на выкананьне загатовак.

Партыйная ячэйка таксама гэтым пытаньнем не займаецца.

Насьценгазэта, якая магла-б шмат дапамагчы ў працы калгасу, ня выходзіць, У рэдакцыю газэты выбран член праўленьня Жоглін, і допісы, якія паступаюць у насьценгазэту, ня бачаць сьвету, бо не падабаюцца яны члену праўленьня Жоглину.

Трэба, каб райкалгассаюз дапамог арганізацыйна наладзіць справу абагульваньня, дапамог выправіць памылку, дапушчаную праўленьнем. Трэба выгнаць з праўленьня апартуністаў, якія ня ўмеюць мабілізаваць масу калгасьнікаў на выкананьне задач, пастаўленых партыяй.

Вока.

Ударыць па зрыўшчыках ільназагатовак

Апрацоўка ільнавалакна ў калгасе „Чырвоны маяк", Мусіцкага сельсавету, праходзіць вельмі марудна. Працдысцыпліна ў калгасе зусім слабая. Зрываюцца часта нарады. Рабочая сіла расстаўлена кепска, скарыстоўваецца нерацыянальна. Праўленьне слаба кіруе апрацоўкай ільну.

Трэба рашуча ўдарыць па зрыўшчыках апрацоўкі і здачы ільнавалакна.

Шпакоўскі Алесь.

Баптысты развальваюць калгас

Баптыцская сэкцыя, якая існуе ў Засьценкаўскім калгасе (Баеўскі сельсавет), Дубровенскага раёну, асабліва пашырае свае агідныя карэньні сярод жанчын. Гэта сэкцыя мае сувязь з цэнтральнымі баптысцкімі арганізацыямі, атрымлівае адтуль літаратуру, лёзунгі і падрывае моц калгасу.

Калгас мае ільнаводчы ўхіл; ня гледзячы на гэта, калгасьнікі не мабілізаваліся на сваячасовую ўборку яго. У выніку лён з 6 гэктараў застаўся на полі. А той які і ўбралі, дык пагнаілі ў пунях. Тое-ж самае атрымалася і з вікай і канюшынай. Трэба сур'ёзна заняцца ачысткай Засьценкаўскага калгасу ад варожых элемэнтаў.

К.

Сваячасовай падрыхтоўкай да веснавой сяўбы—умацуем арганізацыйна калгасы

Рыхтуемся да сяўбы

Наш калгас „Расьсьвет" (Асьвейскі раён) распачаў падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі.

Рамонт інвэнтару і машын ужо распачалі. Праўленьне вылучыла аднаго члена праўленьня, які адказвае за сваячасовае скончэньне рамонту. Мы добра памятаем памылкі мінулага году і таму зараз не дапушчаем абязьлічкі.

Ліквідацыя абязьлічкі дапаможа нам палепшыць догляд жывёлы. Лён увесь здалі дзяржаве да 10-XII, трасты—5 тон і ільнавалакна—13 цэнтнэраў.

Наш калгас прымае актыўны ўдзел у мабілізацыі сродкаў. Калгасьнікі падпісаліся на пазыку „3-ці рашаючы" на 275 руб.

Аржанік Н.

Вывучаем трактар

Наш калгас „КІМ" разгарнуў працу па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі. Ужо прыступілі да ачысткі насеньня. На гэту працу пастаўлены спэцыяльныя брыгады. Арганізавалі сваю майстэрню па рамонце інвэнтару і машын. Мы цьвёрда парашылі выйсьці сеяць вясною з добра падрыхтаваным інвэнтаром.

Многа дапамагла нам зьдзельна-прэміяльная сыстэма аплаты працы, якую мы ўвялі. Лепш сталі працаваць, наладзіўся добры выхад на працу.

Наш калгас парашыў падрыхтаваць свае кадры трактарыстаў, і зараз 12 калгасьнікаў, з іх 6 чалавек жанчын, займаюцца ў гурткупа вывучэньні трактара.

Апрача таго ў нас працуе партшкола, якую наведваюць многія калгасьнікі і калгасьніцы.

Алеся і Лышко.
Полацкі раён.

Завербаваць ня менш 5 укладчыкаў.

Калгасьніцы аршанскага раённага зьлёгу ўзялі на сябе наступныя абавязкі па фінэстафэце: уступіць усім у ашчадкасу, завербаваць ня менш 5 укладчыкаў з калгасьніц, прыняць актыўны ўдзел у распаўсюджаньні пазыкі і праверыць у калгасах рэгулярнасьць выплаты грошай. **А.**

Калгасьнікі Полацкага раёну здаюць хлеб дзяржаве.

Каця Лутянкова

Янка Скрыган

1

Ён прыгнуўся каля яе — разам з ёю — над апокамі *), над люшніцамі **), над ланцэнткамі **) — над чорнаю фармовачнаю зямлёю. Ён блізка прысеў каля яе, і гэта здаецца лірыкаю. У іх мабыць нейкая цёплая інтымная гаворка—дружба. І яму мабыць нялоўка за сваю гэту няўчасную дружбу — узяўшы ад Каці ланцэтку, ён водзіць ёю па зямлі.

— Ня цяжка?

— Не. Гэта як мне былі далі буйныя дэталі, дык тады цяжкавата было. Зафармуеш, бывала, а апоку ледзьве павернеш. А гэта нічога.

— А з бракам як?

— А з бракам горш, — Каця гаворыць, не перарываючы работы. Яна бярэ у Белазерскага ланцэтку і згладжвае крайкі зьлежанай зямлі, адкуль толькі што выняла мадэлі. — З бракам горш. Я ўжо была дайшла да таго, што ні давала бадай што ніводнага процанту, а зараз зноў падымаецца.

— Дык чаму-ж гэта?

— А гэта таму, што ў мяне цяпер вучні. Вось бачыш, — яна паказвае на шар апокаў, што канцамі ўпіраюцца ў сьцяну, — гэта работа прымацованых да мяне вучняў. Ну, у іх і брак пападаецца. А раз гэта вучні мае— то і брак ідзе на мяне.

Белазерскі на трошкі маўчыць. Ён глядзіць перш на Кацю, адале апускае вочы і, нешта пра сябе думаючы, сунімаецца на Каціных руках. Рукі доўга абхарошваюць земляную мадэль і толькі тады, калі канчаюць яны сваю работу, Белазерскі перарывае думку.

— А як з Мурашоваю?—гаворыць ён зноў, і пальцы шукаюць, каб чым-небудзь заняцца.

— І тут няважна. Я яе выклікала на сорак адну апоку. Ну і зрабіла-б сама лёгка. От глядзі: да дзьвёх гадзін я зафармавала трыццаць шэсьць апокаў, а на больш не хапае рам. І гэтыя па ўсім цэху зьбірала. — Дастаючы памачок ***) Каця прыгнулася так, што ледзь не націснула на апоку. Асьцярожна падымаючыся, каб не зачапіць фармоўкі, яна зьнячэўку пахіснулася на Белазерскага. Белазерскі надтрымаў малюсенькім дотыкам і можа ад гэтага ёй захацелася паправіць хустку, прыбраўшы са шчакі невялічкую палойку валасоў. На трошку Белазерскаму відзён быў яе профіль — тонкі, сур'ёзны і тэю-ж сур'ёзнасьцю астаўся зьнячэўку кінуты ад нялоўкасьці погляд. Але яна зноў нагнулася над работаю і зноў загаварыла так, як-бы не перарывала гаворкі. —Ад гэтага сёньня і ўмовы ня выканаю. Але от я перайшла на іншыя дэталі: ня там, дык тут, а вазьму. Толькі нядобра, што даводзіцца так раскідацца...

Белазерскі яшчэ доўга астаецца нагнутым каля Каці. Гэта здаецца лірыкаю. Але гэта — самая простая чалавечая чуласьць і цяплынь. Каця—лепшая ўдарніца па афармоўцы ў ліцейным. І ня зайздрасьць, ня кпіны акружаюць Кацю. Яе акружае чалавечая чуласьць. Вось ён, Белазерскі— сакратар парт'ячэйкі—у канторцы ў Аграната ўгледзеў, што ў Кацінай графе падымаецца брак. І нават у часе работы ён ня сьцерпеў, каб ня прыйсьці і не даведацца, што ў гэтым прычынаю. Можа, што перашкаджае, можа дапамагчы трэба?

... Апокі?

— Ну, пэўна. Здавалася-б дробязь. А дзе от іх возьмеш. Бегай па ўсім цэху, шукай. І няма. А тады і спаборніцтва як сьлед ня ўлічыш... Давялося перайсьці на іншыя дэталі.

— Дзівачка. То ты-ж бы прышла дый сказала. Дапамаглі-б. А то што-ж—аднаму бывае і ня здужаем няўпраўкі. Тое самае і з вучнямі. Чый брак, таму трэба і запісваць. Кожны за сваё павінен адказваць. А то што-ж — абязьлічка? Вось бачыш. А ты і ня скажаш... Дзівачка...

Каці добра адчуваць такую добрую беражлівасьць. Ад гэтага хочацца нешта сказаць, але словы ня выходзяць і, ад нялоўкасьці, мелькам зірнуўшы на Белазерскага, яна папраўляе на шчаках хустку, як-бы там зноў выпалі няпрошаныя палойкі валасоў. Нагнуўшыся зноў, яна ўжо ня бачыць, як, устаючы, Белазерскі сабраў увесь параскіданы ёю ў рабоце струмант і паклаў каля яе напашэве.

2

На біржы далі пісульку. На заводзе з пісулькаю паслалі ў цэх, сказаўшы да каго зьвярнуцца. У канторцы Каця застала нейкіх людзей. Людзі талкавалі, спрачаліся, пальцамі паказваючы, ў сьпісаны аркуш паперы. Каця запамятала, што гаварылі пра чыгун і пра лічбы. І яшчэ запамятала: непадатліва спрачаўся невялікі, а шырокім твар м і губамі чалавек, гаворачы цяжка, як ня ўмеючы і то насоўваючы, то назад адкідаючы шапку. Пасьля яна дазналася, што гэта быў начальнік цэху. Калі вышлі мужчыны, Агранат заўважыў яе.

*) Апокі—рамы для фармоўкі дэталяй.
**) Люшніцы, ланцэткі—прылады для абхарошваньня сфармованае зямлі.

***) Памачок—кноцік з анучы, каб змочваць сфармованую зямлю.

— А ты-ж чаго хочаш, дачушка?

Каця паказала пісульку.

Прачытаўшы, Агранат зірнуў на Кацю і ад таго, што ён рыўком адкінуў назад шапку, Каці запомнілася белая незагарэлая палоса ілба.

— Ну, і малайчына... Нідзе не працавала да гэтага?—запытаўся Агранат, гаворачы па-свойску, так, як-бы ён даўно ведаў Кацю.

— У Брылеўскім калгасе.

— Не на вытворчасьці?

— Я працавала ў пральні... бялізну мыла,—паправілася Каця і, ня ведаючы ці так адказала, зашчыпала пальцамі стол.

— А так, на заводзе—не?

— Не.

— Ну, нічога, навучымся. Хадзем-жа, я цябе і завяду, — і ён неяк па-свойску ўзяў за плячо.

Цэх Каці здаўся страшным. Фармоўка. Ніколі ня бачыла. На ўсю залю—чорная пухкая зямля. Па зямлі шныпарацца людзі, поўзаюць, набіваюць ёю нейкія формы. І можа ад зямлі — і цэх, і формы, і людзі здаліся чорнымі. І над усім—маўклівая глухая работа. Мелькам яна заўважыла, як, нізка прыгнуўшыся над формаю, нейкі чалавек абхарошваў земляную дэталь. Якая вялікая патрэбна асьцярога ды ўвага. Яна ніколі не навучыцца такой тонкай рабоце. Можа адмовіцца ды пайсьці да хаты?

Але нейкі новы чалавек вядзе ўжо па цэху.

— Мы вас прымацуем да добрага хлопца. Навучыць, нічога,— як-бы дагадваючыся пра Каціну думку, гаворыць новы чалавек.

— Малеў! — клікае ён яшчэ здалёк. — Вось табе памочніца. Навучай і не давай нудзіцца.

Каця таксама нагінаецца і глядзіць за Малеваю работаю. У чыгуннай раме шчыльна набіта зямля. Малеў здымае з рамы цяжкую накрыўку і ў зямлі відно, як ляжаць мэталёвыя мадэлі. Каця ня ведае, навошта і як гэта робіцца. Адкуль тут пачатак? Але Малеў таксама, як-бы разгадвае Каціны думкі, і тлумачыць.

— Гэта робіцца так... Цяпер трэба асьцярожна павымаць мадэлі і ў зямлі наастаюцца формы. Уся гэта рама з зямлёю—апока. Наверх накладзецца такая самая апока з формамі, але так, каб кожная палавіна формы супала. Збоку вось—вушкі. Наклаўшы, трэба моцна заклінаваць вушкі чокамі — зачыкаваць. Клінаваць асьцярожна, каб не здрыганулася зямля. Зьверху вось робіцца дзірка — літнік. Яна пападае ў пустое месца — у формы, і праз яе заліваць мецца чыгун. Чыгун у сярэдзіне апокі разальлецца па формах, застыне, а калі яе пасьля разьняць, дык на месцы формаў будзе вось такая-ж дэталь, як гэтая мадэль.

Чутачку пабіваючы, Маляў асьцярожна вінтом дастае мадэль з зямлі. Адну, другую... і ў роўнай раме апокі астаюцца формы. Пасьля беражкі ён праўляе маленькімі жалезнымі лапатачкамі. І там, дзе беражкі парушылі сваю шчыльнасьць, змочвае вадою.

— Ог-так, вымаючы бывае, што зямля дзе-небудзь падымецца або расьпіхнецца, тады яе трэба праўвіць гэтаю ланцэткаю ці кручком. А каб зямля была тужэй, дык яна змочваецца памачком, тады яна ня так абсыпаецца.

— А навошта парашок? — пытаецца Каця, гледзячы, як увесь верх апокі пасыпаны белым мучнаватым пылам.

— Гэта—лікаподзі. Парашок такі—праўда. Ад яго тужэць зямля і, калі накласьці верхнюю форму, дык зямля верхняе апокі не прыставаць ме да ніжняе. А яшчэ і тое, што калі будзе заліваць чыгун, дык лікаподзі выгараць ме, даючы магчымасьць выходзіць чыгуннай пары.

Каці здалося, што яна ніколі не асіліць гэтага Вырабіць з зямлі дэталь такою, каб у яе пасьля заліваць чыгун. Гладзіць, абрэзваць, баючыся, каб не скранулася з месца ніводная драбніца? Ведаць што для чаго? Не, у яе ніколі ня зложацца рукі, каб так сьмела, як воскам валодаць зямлёю, адрэзваючы і прыкладаючы яе скіпкамі.

Можа, што перашкаджае, можа дапамагчы трэба.

Але праз пару дзён падыходзіць той самы чалавек, што аддаў яе Малеву. І Каця ведае ўжо — гэта брыгадзір Пераплётчык. Ён нагінаецца і глядзіць, як нясьмела ходзяць Каціны рукі. Яны баяцца, каб не разбурылася ад неасьцярожнага дотыку зямля. І струманты неяк ня слухаюцца: выпадаюць, чапляюцца за кожны замятак. Яна ніяк ня можа добра абрэзаць лішняга бугарка, што як на кепства адціснуўся ў форму. Пераплётчык памагае і кажа, што вельмі добра. За такі невялікі час і такая складнасьць. Дзе-ж складнасьць, калі яна катора пара як марудзіць над аднэю дэталлю? Але ўсё-ж падымаецца ахвота. Каця раптам верыць Пераплётчыку, што можа яна і папраўдзе сама сябе занадта гудзіць. Пераплётчык пайшоў, і ў Каці сьмялей захадзіла ланцэтка. Не, праўда — яна такі моцна трымаецца, гэта зямля... А яшчэ праз дзень Каця сьпяшалася, ледзь ня бегла да хаты—ёй далі самастойную работу і за дзень яна зрабіла шаснаццаць апокаў. Хацелася хутчэй расказаць дома, што яна ужо сапраўдная фармоўніца. І якою доўгаю зрабілася тады вуліца Сьцяклова — ніяк не дабегчы да хаты.

3

Аднойчы ў Каці разбалелася галава. З дому яшчэ, ідучы на работу, яна была цяжкаю і шумела, як жорна. У гэты дзень ня спорылася работа. Рукі хадзілі вяла, ападалі і, здавалася, як ніколі ня слухаўся струмант. На перапынку Каця ня вышла, як заўсёды, з дзяўчатамі, на двор. Асталася ў цэху каля сваёй апокі. Не хацелася, каб бачылі яе непатрэбную вяласьць.

Суседка па рабоце Мурашова заўважыла і падышла.

— Замарылася, мабыць?

— Не, так проста, нездаровіцца.

— Дзіва што. Бо дурная.

— Чаму?

— Так робячы, як ты, і ногі выцягнеш.

— А, не — гэта не ад работы. Проста, так сабе.

— Так, ды ня так. Што я ня бачу? Я гляджу за табою: вельмі-ж ты ўжо прыткая. Бярэш, як агнём гарыш. А так доўга не пацягнеш.

Каця паказала пісульку.

Ужо от „нездаровіцца“, а што-ж, калі гадоў колькі так?

— Ай, кінь ты, — Каця зашпіліла рукаў і, як-бы не пра гэта думаючы, пагладзіла лоб.

— Дурная. Быдта я яе ад чаго адгаворваю. Я толькі кажу, што няма куды гнацца. Век вялік — напрацуешся яшчэ. А мне проста шкода, што ты не шануеш сябе.

— Як жа гэта шанаваць? Працую як усе, і толькі. І ня думай, што я цягну над сілу.

Каця зноў пагладзіла лоб. Мурашова паглядзела на яе і ўпяршыню заўважыла: каля губ у яе закруглілася танюсенькая маршчынка.

— Узяла-б бюлетэнь.

— Ды я ня хворая, кінь ты.

Суседка памаўчала. На локаць прылегла і завадзіла пальцам па доле. Адале загаварыла, ужо далоньню згладжваючы ямкі.

— Усё роўна ў нас аднакія дэталі: давай разам рабіцьмам—і табе і мне лягчэй будзе.

— Давай,—згадзілася Каця.

З гэтага дня Мурашова завязала дружбу. На рабоце неўзаметку расказвала пра сябе. На перапынках далёка заводзіла ў сад і, качаючыся ў траве, выцягвалася на сонцы поўнымі грудзьмі.

— Хлопцы любяць цябе?—і, не чакаючы адказу, сама гаварыла:—мяне — любяць. А ведаеш Каця, ты ўсё—адна... Давай увечары паедам на Мельнікаў луг. Любата. Пакупаемся. На лодцы паезьдзім... Будуць хлопцы—далёка ў лес зойдам, ведаеш? — туды, на той край. Трава якая—схавацца можна. Глушэча...Давай.

І разам з дружбаю Каця заўважыла, што ў яе пачаў падымацца брак. Яна ня можа даўмецца, адкуль-жа бярэцца гэты брак, калі з кожным днём яна ўсё больш лоўчыцца. Пераплётчык пытаецца, чаму гэта, але хіба-ж яна ведае.

— Сама ня ведаю. Здаецца, раблю так, як і заўсёды. Нават яшчэ больш прыглядаюся, і от... ня ведаю...

— Нават брыдка перад іншымі стала ў брыгадзе. Нават дахаты прыходзіла моўчкі і было ня-добра, калі распытвалі, чаго прысьмірэла.

А Бабічаў наважыў арганізаваць жаночую брыгаду. Узяў Кацю. Суседкаю стала Ладыгіна. З новаю дэталлю асвойталася хутка. Ладыгіна не дакучала дружбаю і ўся брыгада ўзялася за работу дружна, так, каб не адстаць ад мужчын. Бабічаў падыйдзе, пагаворыць, запытаецца.

— Ну, як?

— Не паддаемся.

— Гэта добра, але за бракам трэба глядзець. Па брыгадзе яшчэ дзевяць процантаў. Гэта многа. Хаця-б да двух зьменшыць, каб даць нават на процант і менш таго, што палагаецца.

Падышоўшы да Каці, Бабічаў прысядае і, ведаючы, што Каця засаромяецца, гаворыць так, каб ня чулі другія.

— А ты малайчына. У цябе ўжо толькі каля двух процантаў.

— А чаму-ж в Мураш?.. хоча запытацца Каця, але абрываецца і, па нахмураным ілбе відно, што нешта ўспамінае. Так, ёй расказалі. Яна і сама пра гэта дагадвалася.

— Нічога...

Паводле нормы ТНБ на дзень трэба даць дваццаць восем апокаў. У кожнай апоцы 4 дэталі. Сто дванаццаць шасьцёрак. Каця даўно перакрочыла норму. Брак дайшоў да нуля. Цяпер Каця ўжо дазналася, што тады Мурашова запісвала свой брак на яе, і выклікала Мурашову на сорак адну апоку.

4

Уночы ішоў дождж, але з раньня паказвала ўжо на добрую пагоду, і цяпер дапякае сонца. Ад гэтага асталася здаровая сьвежасьць. Пыл змыўся, прыбіўся, і заводзкі двор выглядвае як-бы большым, чысьцейшым, прыбраным. Наводшыбе, вымытым зяленівам, здаецца, нават памаладзеў сад. Ад саду, ад зяленіва нясе сьвежасьцю, пахам, падмяняючы прывычную мэталёвую сінь і вагранкавы гар. Сонца падае ў сьвежасьць здаровым прыпёкам, ад зямлі падымаецца сытая вільгаць—і добра ўбіраць у сябе гэтую сытасьць грудзьмі.

На перапынку рабочыя выходзяць на двор.

— Любата! От, каб цяпер на Сож, ды на Мельнікаў луг.

— Ыч, чаго захацеў. А вечар тады дзе дзенеш?

— І вечару даў-бы спосаб. Уг-га!

— Ды відаць, што ты выцягнуў-бы... Дай сесьці.

Галалобы хлапчына, выпучыўшы грудзі, фізкультурным гэстам тузануў разы пару ўгору рукамі і, даючы месца, пасунуўся на дошцы. Насупраць паўзьбіраліся на парожныя тары. Рашпільваючы грудзіну, нехта ўлёгся на дылі. Выходзячы з цэху, нейчы голас адчайна рвануў „гоп са смыкам“, але сарваўся, і на яго месца лінуўся ахапак дружнага сьмеху. Выпіхаючы сьпевака „гоп са смыкам“, выскачылі дзяўчаты.

— Ыч, якая рэзвая мая каманда, — сядаючы на спарожненае месца, жартуе Бабічаў.—Папрабуй, займіся з імі.

— Я бачу, што Бабічаў і сам нешта за апошнія часы падпарастаўся. Аж яны мабыць і яго цугуюць!

— Але, аж памаладзеў, проста сьвеціцца — вось што значыць жаночы начальнік.

— Дык ад таго-ж і прамфінплян нешта стаў падгаджваць. Пераплётчык пераганяе, — абзываецца голас з тары.

— Хто гэта? Голубеў? Э, браце, ты хаця мяне дагані, — *махаючы* рукою і жмурачыся ад сонца, гаворыць Бабічаў.—Пераплётчык пераганяе, гэта верна. Але-ж ён пераганяе не таму, што я спушчаюся ўніз, а што стаю на месцы, не ўцякаю. А ўцячы думаю, але вось...

— Верна!

— Але вось ты чаму так астаўся?



— Так робячы, як ты, і ногі выцягнеш.

— І я пераганю! Вось укамплектую як сьлед брыгаду—і пераганю.

— Во! А то хіцёр—забраў ад мяне самых лепшых работнікаў і цяпер сьмяецца. Ну вот: Зайцава ў цябе, Ладыгіна ў цябе, Лапянкова ў цябе — ды я з гэткімі работнікамі горы варочаў.

— І Голубеў варочае. Насыпле каля сябе кучу, ды варочае ў апоку.

— Ну вось з „гэтакімі работнікамі“ і я гавару сьмела. Цяпер пацягаемся, кажу,—не паддаецца Голубеў.

— І я пацягаюся — глядзі як добра: у самую грудзіну сонца пячэ,—пацьвельвае голас з дылі.— Ляжу і пацягаюся.

— Дальбо, шкода,—памаўчаўшы, зноў гаворыць Бабічаў. — Аддаў людзей на чужы прарыў, дык цяпер яму добра і жартаваць,—ён чухае патыліцу і сажмураны твар дабрадушна ўсьміхаецца.—Але пачакай: вось натранірую новую сваю каманду, тады — усе сьцеражыся. Жанкі, брат, народ заўзяты.

— А памятаеш ты, як мяне пацьвельваў? — падыходзіць Пераплётчык. Але, павярнуўшыся, ён гаворыць да ўсіх.—Заключылі спаборніцтва. У мяне маладая брыгада. Бяром — бяром, наляга-ем — налягаем, і—хоць ты зарэжся: ні тпру, ні но. Я і сам бегаю, памагаю, а ён падыходзіць з Агранатам, растапырвае ногі дый рагоча. У мяне ўжо, кажа, за дзевяноста восем. Вот, думаю, назола, чым-жа ён хваліцца, калі ўмова на сто з гакам? Дай лапу, кажу! На-а, кажа, і ўсё сьмяецца. Умова, кажу, на сто з гакам? З гакам. Ну дык кажу, я ручаюся, што і гак вазьму... Ну, от і ўзяў. Сто дваццаць ёсьць.

— Малы гак, малы.

— Разгон ня важны, — жартуюць мужчыны.

— Ну, гэта-ж не канец—возьмам і болей.

Завод адпачывае перапынкам. Сьціхла гамонка жалеза—ажывілася гамонка людзей. Ад мэханічнага цэху чутны нейкія спрэчкі і рогат. Каля ліцейнага сабралася кучка прачытаць на дошцы вывешаныя лічбы выкананьняў. Сіняю кашуляю па дварэ прабег інжынэр Фэльдман... Уночы быў дождж. Двор ад прыбітага пылу здаецца прыбраным. На водшыбе, вымытым зяленівам, шэпчацца сад. Ад саду, ад зяленіва разносяцца сьвежыя пахі. Сонца падае ў сьвежасьць здаровым прыпёкам, і сытую прагнасьць выдыхае зямля.

— Любата!

— Што ты ўсё з любатою! Ня месьцішся?

— Эх-бы на Сож ды на Мельнікаў луг!

— Во ўдарыла хлопца.

— Забрала.

— Ну і сволачы!—умешваецца раптам новы голас. — Што яны робяць з Кітаем? — Седзячы наводшыбе, у руках чалавек трымае газэту. — Катора пара, як таўкуцца. Ангельцы, японцы — усялякая ненасытная дрэнь. Глядзі от, — ён аддае газэту другому, — зноў пачалі напіраць на чырвоных.

— Але е. Там заварыла здорава. Ды хто каго возьме?

— Во-озьме. Па-мойму, каб я быў за Сталіна—яй-бо ня ўцерпеў-бы, а ўмяшаўся-б.

— Во прыткі.

— Ня думаючы?

— Ня думаючы.

— А каб падумаў, то і развалжаў-бы іначай. І памагаць трэба ўмець. На кожны час і свая тактыка і свая дапамога. Думаеш, абавязкова трэба рынуцца са стрэльбаю?

— Ня ўцерпеў бы, яйбо, — на сваё напірае хлопец.

Паўз цэх дваром прайшлі дзяўчаты. З саду нехта зацягнуў прадушыстую кветку прэрый, чутую ў тэатры з „Роз-Мары“. Чалавек з дылі падняўся на локаць і, угледзеўшы дзяўчат, крычыць.

— Лапянкова! Ладыгіна!

— Чаго ты?—сунімаюцца тыя.

— Чаго вы там швэндаецеся—у нас тут адны мужчыны!

— А нам што?

— Хадзеце сюды — весялей будзе.

— Абыйдзецеся і бяз нас... Няма часу,—і, пакінуўшы росьплескі сьмеху, пабеглі накас двара, хаваючыся за карпусамі.

— Тота-ж — няма часу. Бач куды пабеглі.

— А ты, ж туды хіба ня бегаеш?

— Вось твая і тактыка. Трэ' было проста са стрэльбаю...

— Ыч, чарцянё. Выradак, — круцячы галавою гаворыць Бабічаў. Ён яшчэ глядзеў ім усьлед, і ня слухаў хлапечых жартаў.

— Бабічаў улюбіўся ў Лапянкову, дапраўды.

— Не кажы ты, Пераплётчык. Не магу падараваць, што давялося аддаць яе Голубеву. Гэта-ж быў мой гонар. Ты разумееш, да таг дайшла, што ўвесь апошні час—ніводнага процанту браку. Ну і работа—самі-ж ведаеце—як агнём. Усё ТНБ перавярнула дагары нагамі. Усе, бывала, нават што лічыліся і лепшымі, дык гэта хаця-б да дваццацёх васьмёх дацягнуць—выцягнуць норму. Ато—дваццаць дзьве—дваццаць чатыры. А яна сорак адну апоку шпурнула... Я ўжо яе і выradкам назваў. Выradак, дальбо!

— І ўсё гэта таму, што ў тваёй брыгадзе. Я ж кажу, што ты камандзір удалы,—не пакідае жартаў нехта.

— Няхай сабе і няўдалы, але я зразу быў падмеціў, што з яе будзе толк. Памятаеш, як размяркоўвалі карткі ўдарнікаў? У яе было тады яшчэ 8 процантаў браку. Дай, думаю, я і Кацю пастаўлю. Тады-ж мы спрачаліся. Казалі, ня варт, не падыходзіць. Але я ведаў, што апраўдае — па рабоце бачыў, што возьме. І вось глядзі ты — разгадаў. Скрозь не здаецца. З таго часу катора пара, і кожны раз стаіць наперадзе. Ды што мне казаць — самі-ж на канфэрэнцыі ліцейнікаў першую прэмію выдалі.

— Дый самое не пазнаць, — памаўчаўшы, зноў гаворыць Бабічаў.—Бывала, як толькі яшчэ прышла яна ў цэх, дык такая пужлівая, баязьлівая—вечна маўчыць, нават слова ня выцягнеш. А гэта, глядзі ты—камсамолкаю стала, колькі ўсялякае грамадзкае работы варочае... Не, дальбо, я шкадую, што аддаць давялося.

Бабічаў дастае закурыць, але гудок на работу, і ён падымаецца з дошкі. У цэх густа шугнулі рабочыя — цесна прайсьці. Даганяючы ззаду, яшчэ раз чуцён той самы голас, крычучы „любата“. З разгону стукнуўшыся аб некага, Каця кідаецца да Бабічава і, яшчэ не патушыўшы прынесенае аднекуль усьмешкі, пытаецца:

— Ня выцела?

— Ого, яшчэ і як, — і, сплюшчыўшы вочы, Бабічаў таксама сьмяецца ўсімі маршчынамі свайго безвалосага жаночага твару.

Менск, 18-I—32 г.

Як жывуць і працуюць тэкстыльшчыцы Чэхаславакіі

Гэта ўжо не работа. Не, гэта маята і гонка з раніцы да канца работы. Капіталістычная рацыяналізацыя ператварыла тэкстыльшчыцу ў машыну.

„Стамляюся я, падаю на лаўку, ледзь трымаюся на нагах. Я шмат год працую ўжо ў прадзільні, але такой гонкі ніколі ня было". Так скардзіцца прадзільшчыца з Хоржыцы. Тэкстыльныя магнаты ва Усходняй Багеміі зьменшылі зарплату і амаль ні ў адным прадпрыемстве ня прытрымліваюцца заключаных калдагавароў. Калдагавор аб зарплаце для іх толькі паперка ў тэй частцы, якая дае некаторую палёгку для рабочых. Так, фірма Нэйман і Фрыдск забараніла працуючым есьці ў рабочы час, ставіць свае пакункі на вокны для таго, каб работніца, разьнімаючы сваю яду, не магла ні на адну хвіліну выйсьці на вуліцу. Яна павінна 8 гадзін стаяць ля варштата, ні разу не павінна падымаць галавы, не павінна выгаварваць ні аднаго слова. Нават за тыя хвіліны, якія трацяцца на „натуральныя" патрэбнасьці, робіцца вылік з пэнсіі работніц.

Станьце ля варот тэкстыльнай фабрыкі. Вы ўбачыце, як яны выходзяць, гэтыя бледныя, зморaныя людзі. Сьмяротна стомленыя, яны выходзяць з фабрычных варот, сьпяшаючыся дамоў для таго, каб там адпачыць. Не, там чакаюць іх галодныя дзеці.

У апошні час прадпрыемца ўжывае вельмі завостраныя мэтады для таго, каб выціскаць, як з лімона, апошнія сокі з работніц. У прадзільні яны звальняюць падсобных работніц і прымушаюць работніц нітачнага аддзяленьня абслугоўваць два варштаты адначасова, а ў ткацкіх аддзяленьях яны патрабуюць, каб работніца ў выпадку браку, сама плаціла цыравальшчыцы; калі-ж здараецца прарыў, то работніцы прыходзіцца самой аплачваць працу праборшчыцы.

Пры нізкай якасьці нітак, што вырабляюцца ў масавым парадку, для таго, каб павялічыць прыбыткі, капіталісты не аплачваюць прастояў, як гэта прадугледжана дагаворам. І такім чынам яны пераносяць выдаткі па аднэй частцы вытворчасьці на саміх рабочых, якія і без таго амаль галадаюць.

Вось прадпрыемніцкія мэтады эксплёатацыі для таго, каб забясьпечыць свае прыбыткі за кошт рабочых мас, выхад з крызісу капіталістычнай эканамічнай сыстэмы.

Сацыял-дэмакратычныя правадыры ўсямерна дапамагаюць буржуазіі ў справе жорсткай эксплёатацыі і падняволеньня рабочае клясы. Ва ўсіх галінах тэкстыльнай прамысловасьці, ахопленых калумовай, яны згадзіліся на зьмяншэньне зарплаты, навязалі рабочым волю прадпрыемцаў.

Тэкстыльшчыцы, якія зьяўляюцца найбольш эксплёатаванай часткай рабочае клясы, павінны ў цесным саюзе з чырвонымі прафсаюзамі і і членамі ў фабзаўкомах, у цесным саюзе з камуністычнымі партыямі абараняць свае патрабаваньні, разгортваць барацьбу.

За павялічэньне зарплаты!

Супроць звальненьня рабочых! За 7-мігадзінны рабочы дзень пры захаваньні ранейшай зарплаты!

За арганізацыю дзіцячых ясьляй з бясплатным доглядам дзяцей!

Супроць прадпрыемчага тэрору, за абарону работніц!

Цясьней згуртуйцеся вакол камуністычнай партыі, якая паказвае рабочым выхад з крызісу, нэндзы, з беспрацоўя!

А. К.

Фані Гютэр—жонка нямецкага рабочага, працуе на зав. „Электраапарат"

Расьце беспрацоўе ў Англіі

Дарагі таварыш! Некалькі дзён таму назад, я прачытала ваш ліст у нашай ангельскай камуністычнай газэце „Дэйлі Уоркер", і я адчувала, што абавязкова павінна вам напісаць.

Я і мая сям'я вельмі рады, што людзі ў Савецкім Саюзе такія шчасьлівыя і здаволеныя, што ваша культура разьвіваецца на дабро ўсяго сьвету, Мне прыдзецца расказаць вам трошкі і аб сабе. Я замужам, сям'я мая складаецца з 5 чалавек, 3 хлопчыкаў і 2 дзяўчынак, адна з іх працуе, рэшта беспрацоўныя, адзін хлопчык 8 год вучыцца ў школе. Я магу сьмела сказаць, што няма такой сям'і ў нашай акрузе, у якой працавалі-б усе працаздольныя члены; усюды пануе нэндза. Моладзь у нашай краіне прападае марна. Вы-б пашкадавалі іх, калі-б убачылі іх пахілыя змардованыя твары, бо ім няма чаго есьці.

У той час, калі—пішу вам гэты ліст, я даведалася, што малады жанаты чалавек, наш сусед атруціўся газамі ў выніку беспрацоўя. Сумна бачыць, як старыя і маладыя валочацца з безнадзейнымі тварамі, бо ў іх няма ніякай пэрспэктывы на будучае.

Калі мне пашчасьлівіцца атрымаць адказ, я ў сваім наступным лісьце напішу больш.

Шатляндыя. **Джона Мак-Лаўчлен.**

НА КАНФЭРЭНЦЫІ МЭТАЛІСТАК ГОМЕЛЯ

Рабочы клюб гарбароў пачаў напаўняцца дэлегаткамі-работніцамі мэталюргічнай прамысловасьці. Дзьверы кожную хвіліну адчыняюцца і зачыняюцца. Грае духавы аркестр. Да сямі гадзін увечары заля напоўнілася работніцамі. Адны з вялікага мэталюргічнага заводу „Сельмаш“, другія з „Пралетары“. Першы раз склікаецца канфэрэнцыя мэталістак, таму вялікая ўрачыстасьць.

Аркестр грае „Інтэрнацыянал“, а твары работніц бадзёрыя, радасныя і адначасова сур'ёзныя.

У парадку дня—пытаньне: вынікі 3-га рашаючага і задачы чацьвертага, заключнага, году пяцігодкі.

Тав. **Афэнгейм** (прадстаўнік гарпрафсавету) завастрае ўвагу на задачы ўкараненьня жаночай сілы ў вытворчасьць. З 3.000 рабочых на заводах „Сельмаш“ і „Пралетары“ колькасьць жанчын складае ўсяго 11 проц., што зусім мала. Такі-ж самы малюнак у адносінах павышэньня кваліфікацыі. З агульнай колькасьці работніц (130 чал.) на „Пралетары“ 90 чал. працуе на некваліфікаванай рабоце, 25 на сярэдняй і толькі 15 чалавек на кваліфікаванай рабоце. А, між іншым, ёсьць шмат работніц, якія працуюць 7 і больш год.

На заводзе „Пралетары“ майстар у такарнага цэху Шапіра і арматурнага цэху тав. Салавейчык кажуць, што жанчына ня можа стаяць на тэй рабоце, што і мужчына, і таму ня ставілі жанчын на кваліфікаваную работу.

Ня гледзячы на такія адносіны, работніцы сябе апраўдалі. Работніца Шары **працуе на замежным варштаце, дае лепшыя колькасныя і якасныя паказальнікі, за што некалькі раз прэміявана. У ліцейным цэху гэтага ж заводу работніца Латынкова—фармоўшчыца, дае лепшую якасьць фармоўкі і перавыконвае норму, за што на працягу году прэміявана 4 разы.**

Аднак да гэтага часу ў некаторых кіруючых работнікаў ёсьць апартуністычная недаацэнка ўкараненьня жаночай працы ў вытворчасьць. Часта чуваць такія размовы: „зноў прыслалі баб, іх ставіць на вышэйшую кваліфікацыю нельга, бо яны ўсё роўна выйдуць замуж“.

Такія яўна апартуністычныя размовы, якія ігнаруюць дырэктывы партыі, павінны атрымаць рашучы адпор.

Жанчыны прымаюць самы актыўны ўдзел у сацспаборніцтве і ўдарніцтве, выкананьні прамфінпляну, вучобе. На заводзе „Пралетары“ ёсьць 3 прыкладныя гаспадарча-разрахункавыя жаночыя брыгады, на „Сельмашы“—адна.

Жанчыны яшчэ слаба ўцягваюцца ў грамадзкае жыцьцё. Гэтаму спрыяюць далёка нездавальняючыя бытавыя ўмовы работніц. На заводзе „Пралетары“, ёсьць толькі адна дзіцячая пляцоўка, што зусім не задавальняе запатрабаваньняў работніц. Крыху лепш справа на „Сельмашы“ дзе намечана і праводзіцца рад мерапрыемстваў.

Пасьля рапарту работніц „Сельмашу“ аб сваіх дасягненьнях пачаліся спрэчкі.

Асабліва дрэнна стаіць справа з павышэньнем кваліфікацыі ў дрэваапрацоўным і лёгка-кацельным цэху, дзе работніцы працуюць па некалькі год і кваліфікацыі не павышаюць. Адміністрацыя, парткалектыў і заўком мала зварочваюць увагі на прэміяваньне жанчын. Няпісьменныя жанчыны ня вучацца, што недапушчальна на сёнешні дзень, асабліва ў нас на такім прадпрыемстве.

Тав. **Ліхціна** („Сельмаш“) адзначыла, што **тэхнічная вучоба сярод жанчын пастаўлена вельмі кепска**, у далейшым неабходна яе разгарнуць.

Выступалі цэлы рад работніц—**Штэйнэр, Пінская, Аронава, Юзфіна, Балоціна** і інш. Яны адзначалі недахопы ў галіне павышэньня кваліфікацыі, сацыяльна-бытавых умовах, вылучэньня на адказную работу і г. д.

Работніцы спадзяюцца, што гэта канфэрэнцыя будзе пачаткам штодзеннай сыстэматычнай работы сярод работніц-мэталістак і пакладзе канец недахопам, якія яшчэ ёсьць.

Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б.

Ф. Тэрман.

Перавесьці брыгады клейшчыц і прэсоўшчыц на гаспадарчы разрахунак

На фанэрным заводзе „Вэзуві“ працуюць 210 работніц. У рабоце яны не адстаюць ад рабочых. Але ўсе яны працуюць на нізкай кваліфікацыі. На вышэйшай кваліфікацыі на шэль-машыне (якая рэжа лісты фанэры) у якасьці шэлераў жанчыны не працуюць. Аб гэтым ніхто і ня думаў. А між іншым на новых шэль-машынах, дзе падручнікі падаюць калоды, а шэлер толькі кіруе машынай, работніца ў поўнай меры можа працаваць. Але да гэтага яшчэ не дадумаліся фабрычныя арганізацыі.

На гаспадарчы разрахунак пераведзены ўсе 4 шэль-машыны (машыны, якія з калоды рэжуць істужку, з якое выходзіць фанэра). Там-жа працуюць і работніцы—цягальшчыцы істужкі. Але дрэнна тое, што рабочыя ня ведаюць аб сваёй штодзеннай выпрацоўцы. Працоўная дабаўка старшаму брыгадзіру і надбаўка па эканоміі матар'ялаў брыгадзе ня выплачваецца. Гэта можа адбівацца на інтэнсыўнасьці і продукцыйнасьці працы брыгад.

На аклейцы фанэры брыгадамі працуюць выключна жанчыны. Але-яны яшчэ не пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Клейшчыцы і прэсаўшчыкі самі падалі заяву аб пераводзе іх на гаспадарчы разрахунак, але гаспадарчыя і прафэсыянальныя арганізацыі не зьвярнулі на гэта ўвагі.

Перавод брыгад клейшчыц на гаспадарчы разрахунак даў-бы вялікую эканомію клею (дэфіцытны тавар) і лепшую якасьць фанэры.

Работніцы ня ведаюць тэхнікі вытворчасьці. **Тэхнічныя гурткі арганізаваны, але заняткі зрываюцца** па прычыне ненаведваньня.

Фанэрны завод працуе на 4-хзьменным графіку. Таму ёсьць магчымасьць перавесьці працу дэлегацкага сходу прыстасоўна да зьмены для лепшага выхаваньня работніц. Але аб дэлегацкім сходзе ніхто ня ведае.

Парткалектыў і фабком павінны падхапіць вытворчы энтузіязм і актыўнасьць работніц фанэрнага заводу, перавесьці брыгады клейшчыц на гаспадарчы разрахунак і высунуць работніц на работу ў якасьці шэлераў і інш.

Е. Ф.

БОЛЬШ УВАГІ КВАЛІФІКАЦЫІ РАБОТНІЦ

(*Гомель*)

У „Палесдруку“ працуе каля 300 жанчын па ўсіх цэхах. Але зусім невялікая частка з іх працуе на кваліфікаванай рабоце, большасьць знаходзіцца на некваліфікаванай і сярэдняй рабоце. Жанчыны-друкара або памоцніка друкара вы тут ня знойдзеце.

І гэта не таму, што тут няма каго зрабіць друкаром. Ёсьць. Тут працуюць такія работніцы, як **Левіна С., Лейбіна, Ямніцкая, якія ў якасьці накладчыц працуюць па 15 і больш год.** А чаму іх нельга зрабіць друкарамі?

Тав. **Цэхаў** (загадчык машыннага цэху) тлумачыць гэта тым, што няма жанчын, якія здолеюць працаваць у якасьці друкара і наогул яны ня хочуць. „Мяне прымусяць, я ўсё роўна не пастаўлю жанчын у якасьці друкара“. Гэта нельга інакш расцэньваць, як упартае нежаданьне выконваць пастанову партыі і ўраду аб кваліфікацыі работніц.

Лепш стаіць справа ў пераплётным цэху. Загадчык тав. Фэйгін больш зацікаўлен у гэтым пытаньні. За апошні час некалькі работніц былі пераведзены на швэдзкія машынкі, у больш кваліфікаваны брашуровачны цэх. Цэхкамітэт таксама займаецца гэтым пытаньнем, таму і лепшыя тут вынікі. Ёсьць лепшыя прэміяваныя ўдарніцы. Работніца **Фрыдман Б. узнагароджана ганаровай граматай ЦВК БССР.**

А вось загадчык лінавальна-сшыткавага цэху—**Кагановіч** сачыць за тым, каб лепшую сталую работніцу перасунуць на вышэйшую кваліфікацыю, прэміяваць за прыкладную работу, павысіць веды па ўсіх галінах і г. д. А таму, у гэтым цэху ёсьць 3 жанчыны ліноўшчыцы, некалькі швэцаў, некалькі брыгадзіраў і інш.

Лепшых ударнікаў і ўдарніц павінна ведаць краіна. Вось прозьвішчы іх: **Любінская** з вучняў вельмі добра пасьпела, добра выявіла сябе ва ўсіх галінах, за што пераведзена на кваліфікаваную працу і прэміявана. **За ёю ідзе тав. Хэйкіна—брыгадзір сшыткавай брыгады, мае 17-гадовы вытворчы стаж, прэміявана і паказвае прыклад у працы па ўсіх галінах. Тав. Гіршановіч—лепшая ўдарніца—сакратар цэхавай камсамольскай ячэйкі.**

Прыкладная работніца **Максімук**—брыгадзір першай гаспадарча-разрахунковай брыгады.

Зараз разгарнулася праца сярод жанчын „Палесдруку“. Ажывілася работа дэлегацкага сходу. Усе дэлегаткі наведваюць заняткі і прымаюць практычны ўдзел у грамадзкім жыцьці.

Большасьць работніц ахоплена рознымі школамі і гурткамі.

Ударніца „Палесдруку“—Хайкіна, мае 17-гадовы вытворчы стаж. Прэміявана як лепшы брыгадзір.

Горш з сацбытавымі ўмовамі работніц. На прадпрыемстве няма ні ясьляй, ні дзіцячай пляцоўкі, што вельмі адбіваецца на працы і вучобе жанчын.

Неабходна яшчэ больш рашуча заняцца пытаньнем укараненьня жаночай рабочай сілы ў вытворчасьць, яе кваліфікацыі і ўдарыць па зрыўшчыках гэтай работы.

Ф. Т.

Актыў ёсьць, а кіраўніцтва няма

Дэлегацкі сход жонак рабочых саюзу будаўнікоў быў выбран у 1930 годзе. Усе жадалі і рваліся на грамадзкую працу. Мне, як старшыні, не давалі жыцьця, усе пыталіся, калі гэта нам дадуць нагрузку. З 19 дэлегатак—9 прымацавалі да сэкцыі гарсавету, дзе яны працуюць ударна, асабліва ў сэкцыі каапэрацыйнай. Дзьве дэлегаткі прэміяваны за ўдарную работу па перапісу насельніцтва і выяўленьні мёртвых душ. У другіх сэкцыях дэлегаткі таксама працуюць добрасумленна. Сярод дэлегатак была праведзена падпіска на дырыжабль „Правда“. Праз падпіску ўсе дэлегаткі сабралі 24 руб. Дэлегаткі прымалі ўдзел і ў нядзельніку па зборы мэталялому.

80 проц. дэлегатак падпісаліся на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“. Шмат іншай работы праробліна нашым сходам. Але дрэнна, што наш сход ня меў кіраўніцтва з боку партколектыву і гаркому, ніхто ніразу не заслухоўваў дакладу аб рабоце нашага сходу.

Ніякіх указаньняў і пляну ня было. Мы слухалі лекцыі аб тэарытычных пытаньнях, і ня ўвязвалі з практыкай. Адсутнасьць памяшканьня для заняткаў зрывалі сходы і, нарэшце, сарвалі канчаткова работу нашага сходу. Не дапамагла і насьценгазэта, куды мы зьмясьцілі 5—8 заметак аб нашым сходзе, але ніхто не зьвярнуў увагі на гэтыя заметкі. У маі забралі ад нас кіраўніка, другога не далі. Такім чынам наш сход вымушан быў распусьціцца. Было вельмі шкада, бо актыў быў моцны. Можна было-б прыцягнуць яго да актыўнай грамадзкай працы. Зараз трэба рыхтавацца да перавыбараў дэлегатак, на што неабходна мабілізаваць актыў.

Іванова.

Гомель.

Ударніцы станцыі Магілеў—на дапамогу чыгунцы

Жаночая ўдарная брыгада ў ліку 11 чалавек абавязьціла сябе ўдарнай па барацьбе са сьнегам.

Гэтыя ўдарніцы — жанчыны зьявіліся да начальніка станцыі Магілеў і дабраахвотна выказалі жаданьне ачысьціць стрэлкі ад сьнегу.

Ударніцы прапрацавалі з 11 гадзін раніцы да 4-х гадзін па паўдні і ачысьцілі ад сьнету 28 стрэлак і 28 краставін. Усяго прапрацавалі 55 гадзін.

Брыгада: **Дроніна. Пучкова, Акончыелава.**

Няма жаночых гаспадарча-разрахунковых брыгад

(*Запалкавая ф-ка „Вэзуві“*)

Работніцы нашай фабрыкі праяўляюць энтузіязм і актыўнасьць не адстаючы ад рабочага. Яны заўсёды ідуць насустрач па выкананьні мерапрыемстваў партыі. Працавалі па-ўдарнаму па выгрузцы бульбы і гародніны. Заданьне па падпісцы на пазыку работніцы выканалі.

Ударная брыгада тав. Фацэевай у зьемальным цэху паказвае прыклады ўзорнай работы. Брыгада выконвае і перавыконвае прамфінплян. Брыгада добра арганізавана. 8 чалавек працуюць на 4 х машынах. Абязьлічка ліквідавана ў брыгадзе. Кожная работніца адказвае за машыну і работу, якую яна выконвае. Уся брыгада прымае актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці фабрыкі.

Усе працуюць дружна, дапамагаюць адна аднэй, каб ня было прастояў машын. Брыгада абгаворвае свае вытворчыя пытаньні, рэагуе на ўсялякія выпадкі недысцыплінаванасьці і няспраўнасьці машын. Старшы брыгадзір пільна сочыць за якасьцю прадукцыі. Яна-ж запісвае працу кожнай работніцы брыгады.

Калі ўлетку адзін месяц быў прарыў, брыгада нястомна працавала па ліквідацыі яго і не засталася ў даўгу перад дзяржавай.

На фабрыцы няма жаночых гаспадарча-разрахунковых брыгад. Трэба хутчэй арганізаваць іх, бо яны могуць даць вялікі эфэкт у паляпшэньні якасьці (асабліва ў каробачным цэху, ад якога залежаць амаль усе цэхі) і эканоміі матар'ялаў—паперы і клейстэру.

На фабрыцы 586 работніц, а ўдарніц 313. Гэта мала. Зусім слаба праводзіцца масавая работа сярод работніц. Дэлегацкі сход не працуе.

Новых работніц многа, а сярод іх слаба праводзіцца выхаваўчая работа. Трэба было-б практыкаваць вечары старых і новых работніц за шклянкай гарбаты з мэтай клясавага выхаваньня новых работніц, каб старыя работніцы падзяліліся ўспамінамі і вопытам сваёй работы. Такія вечары маюць вялікі ўплыў на ўкараненьні ў новых работніц сацыялістычных адносін да вытворчасьці.

Ёсьць многа работніц, вымучаных на адказную работу загадчыкамі цэхаў і намесьнікамі дырэктароў і інш. Многа прэміяваных ударніц, але няма ніякага ўліку.

Па павышэньні кваліфікацыі работніц і высоўваньні іх на вышэйшую кваліфікацыю не скарыстаны ўсе магчымасьці. У мэханічнай майстэрні няма ніводнага сьлесара або токара жанчыны. Манцёрамі каробачных машын таксама няма работніц.

Лепшая ўдарніца запалкавай ф-кі „10 кастрычнік“ (Рэчыца) Ліда Абрамовіч—заг. клеечнага цэху.

На пакатальных варштатах працуюць адзінкі работніцы. Усяго работніц на фабрыцы 66,4 проц., а па вядучых прафэсіях яны ніякай ролі не адыгрываюць.

Рост партыі за лік работніц за апошнія 6 месяцаў ня дрэнны. Прынята на фабрыцы і фанэрным заводзе 51 работніца. Гэта ўскладае вялікую адказнасьць на партарганізацыю па выхаваньні гэтых кандыдатаў партыі. Ёсьць многа выпадкаў, што работніцы застаюцца кандыдатамі партыі па 2 гады замест 6-ці месяцаў. Аб гэтым у свой час пісала гомельская газэта „Палеская Праўда“. Цэх'ячэйкі і парткалектыў слаба праводзяць выхаваўчую работу сярод кандыдатаў партыі. Няма асобнага падыходу да больш адсталых кадыдатаў партыі работніц. Зразумела, што пры такіх абставінах работніца не падрыхтавана да пераходу ў члены партыі.

З усіх прыведзеных фактаў партыйная і прафсаюзная арганізацыі фабрыкі павінны зрабіць належныя вывады. Неабходна палепшыць масава-выхаваўчую работу сярод работніц, асабліва новых. Пытаньне арганізацыі гаспадарча-разрахунковых брыгад і высоўваньня работніц на вышэйшую кваліфікацыю павінна зараз стаць у парадак дня фабрычных арганізацый.

Брыгада: **Е. Эпштэйн,**
Н. Галянская.

Нова-Бел'ца.

Узмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне работніц, растлумачыць глыбей ленінскую нацпалітыку

Работніца бручна-баваўнянага цэху Гомельскай швэйнай ф-кі „Камінтэрн“ **Васільлева** раззлаваўшыся на другую работніцу, назвала яе „польскай кроўю“ і іншымі словамі.

Гэты шавіністычны выраз Васільлевай паказвае, што яна знаходзіцца пад уплывам клясавага ворага, які імкнецца парушыць клясавую салідарнасьць сярод пралетарыяту і сеяць нацыянальную розьнь.

Васільлева—адсталая работніца, палітычна несьвядомая. Цэхкамітэт і агульны сход рабочых і работніц папярэдзілі Васільлеву, што пры паўтарэньні такіх выпадкаў яна будзе выключана з саюзу і зьнята з работы.

З гэтага выпадку фабком павінен зрабіць вывады аб неабходнасьці ўзмацненьня культурна-масавай выхаваўчай работы сярод работніц па растлумачэньні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Рабкорка.

Гомель,
швэйная фабрыка
„Камінтэрн“.

ГПБ Сл.-Аз.

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ БАРАЦЬБЫ З НЯПІСЬМЕННАСЬЦЮ

Шырэй распаўсюдзім пазыку „За суцэльную пісьменнасьць БССР“

З мэтай садзейнасьці ператварэньню БССР да 1-га мая 1932 году ў краіну суцэльнай пісьменнасьці НКАсьветы, ЦСПСБ і Цэнтральным Саветам т-ва „ПН“ выпушчаецца пазыка „За суцэльную пісьменнасьць БССР“.

Пазыка выпушчаецца ў 2-х сэрыях: сэрыя № 1 для няпісьменных (за вучобу) і сэрыя № 2 для культармейцаў, кіраўнікоў, інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, аграномаў, на выкладаньне ў лікпункце або ў школах малапісьменных.

Пазыка выдаецца трымальніку дармова, але трымальнік пазыкі абавязан пагасіць сваю пазыку: Па сэрыі № 1 пагашаецца наведваньнем заняткаў лікпункту, па сэрыі № 2 кіраваньнем лікпунктам, школай малапісьменных, вядзеньнем тэхніка-аграномічных і палітычных гадзін і арганізацыйна-мэтадычнай работай па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Кошт кожнай пазыкі—90 гадзін навучаньня або выкладаньня.

Пазыка выпушчаецца па сэрыі № 1 тыражом 300.000, па сэрыі № 2—30 тысяч.

Па пазыцы адбудуцца два розыгрышы. Адзін у лютым і другі ў маі. Прымаць удзел у розыгрышы мае права той трымальнік пазыкі, які пагасіць палову талёнаў—гэта значыць 45 гадзін заняткаў і другі раз рэшту—45 гадзін.

Разыграна будзе ўсяго 1220 выйгрышаў на агульную суму 25.000 руб. Сярод выйгрышаў—месцы ў санаторы, дамы адпачынку, экскурсіі, на Каўказ, у Маскву, Ленінград, Днепрабуд, новабудоўлі БССР, велёсыпэды, жаночыя і мужчынскія польты, швэйныя машыны і рад іншых рэчаў.

Працоўныя жанчыны, разгарнеце работу па распаўсюджаньні пазыкі сярод няпісьменных жанчын і жанчын-культармейцаў. Разгарнеце шырокую барацьбу за суцэльную пісьменнасьць жанчын.

Дыяграма росту Усенавучу ў СССР.

Работніцы, калгасьніцы і працоўныя сялянкі, прымайце актыўны ўдзел у барацьбе за суцэльную пісьменнасьць БССР. За датэрміновае ператварэньне гарадоў, прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў у суцэльна-пісьменныя! **Арлоўскі.**

Бярэце прыклад з Гомеля

Гомельскія арганізацыі бальшавіцкімі тэмпамі вядуць барацьбу за агульную пісьменнасьць. Гомель дабіўся 100-проц. ахопу вучобай няпісьменных да 12 гадавіны выданьня ленінскага дэкрэту аб ліквідацыі няпісьменнасьці.

Мэтады і формы былі ўжыты наступныя:

Спачатку праведзена шырокая растлумачальная работа. Перадавыя прадпрыемствы гораду, дабіўшыся 100-проц. ахопу, узялі на буксір адстаючых. „Палесдрук“ вылучыў буксірную брыгаду культармейцаў і паслаў на прадпрыемствы Нова-Беліцы, „Вэзуві“ і дрэваапрацоўчы камбінат, жылкаапэрацыі і інш.

Абвешчан і праведзен штурм, у часе якога кожны няпісьменны, наведваючы лікпункт або школу, павінен быў уцягнуць у лікбез няпісьменнага свайго таварыша. Гэта мерапрыемства дало значныя вынікі.

На „Вэзуві“ была ўжыта такая форма: да кожнага камсамольца, які наведвае партшколу, прымацавалі няпісьменнага, і камсамолец, ідучы на заняткі ў партшколу, заходзіў за прымацаваным і вёў яго на заняткі ў лікпункт.

Шырока мабілізаваны масы працоўных Гомелю на барацьбу з няпісьменнасьцю. Нізавы друк і „Палеская праўда“ разгарнулі апэрацыйна-масавую работу, сыстэматычна асьвятляючы работу лікпунктаў, школ на сваіх старонках, выяўляючы дадатныя і адмоўныя бакі, мабілізуючы масы на канкрэтных прыкладах. **А.**

Да адказнасьці зрыўшчыка ліквідацыі няпісьменнасьці

Старшыня калгасу „Чырвоны шлях“ (Сураскі раён) ня толькі не дапамагае сваёй жонцы ліквідаваць няпісьменнасьць, а нават перашкаджае.

Аднаго разу, калі жонка была на лікпункце, ён замкнуў дзьверы і, калі прышла яна з лікпункту, яе вылаяў, прыгаворваючы: „Ідзі і начаваць на лікпункт“. У выніку жонка яго прымушана была прасіць кіраўніка лікпункту аб пакараньні свайго мужа за такі ўчынак. Пракуратура Сураскага раёну павінна прыцягнуць да адказнасьці зрыўшчыка баявой палітычнай кампаніі—ліквідацыі няпісьменнасьці. **Арлоўскі.**

У Чачэрску няма работы сярод жанчын

Кепска з працай сярод жанчын у Чачэрскім раёне. Жанарганізатар Яроменка да гэтага часу пальцам аб палец ня ўдарыла для правядзеньня важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній, як загатоўкі, фінэстафэта. Нават дэлегаткі ня былі мабілізаваны.

Адзін праз быў назначан сход дэлегатак. Дэлегаткі зьявіліся, а жанорга няма. Далей так цягнуцца ня можа.

Чачэрскі райком партыі павінен рэагаваць на такія зьявішчы. **Гельдзіна Л.**

ЗА 100-проц. АЧЫСТКУ НАСЕНЬНЯ

Згодна пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб правядзеньні веснавой сельскагаспадарчай кампаніі 1932 году павінна быць павышана ўраджайнасьць збожжавых культур на 12 проц., тэхнічных (ільну і канапель)—на 15 проц.

Якасьць насеньня мае вялікае значэньне для павышэньня ўраджайнасьці. Ад кепскага насеньня будзе добрага ўраджаю. Буйное насеньне мае ў сабе больш спажыўных матэрый. У часе прарастаньня насеньня парастак жывіцца тымі матэрыямі, якое ўтрымлівае ў сабе насеньне. Чым больш спажыўных матэрый мае насеньне, тым парастак лепш прарастае, добра ўмацоўваецца і атрымліваецца добрая рунь.



Зборка першай савецкай льномялкі.

Для гэтага быў зроблен такі вопыт. Бралася 100 зярнят вагою ў 4 3/4 грам, 3 1/3 гр., 1 2/3 грам. Пры пасеве ў аднолькавую глебу па сваёй якасьці былі атрыманы такія ўраджаі:

Першыя	100	„	„	4¾ гр.	далі 1085 гр. ураджаю
Другія	100	„	„	3⅓ гр.	„ 1085 гр. „
Трэція	100	„	„	1⅔ гр.	„ 783 гр. „

Таксама трэба ведаць, колькі загінула штук расьлін на зіму.

У першай сотні буйнога насеньня	13 расьлін
У другой сотні сярэдняга „	31 „
У трэцяй сотні дробнага „	57 „

Гэтыя лічбы паказваюць, што ад буйнога насеньня гіне менш зімою расьлін, і яны лепш пераносяць яе.

Самы просты спосаб паляпшэньня насеннага матар'ялу робіцца праз сартаваньне яго.

Арфаваньне насеньня. Гэта самы просты мэтад сартаваньня насеньня Арфаваньнем насеньня мы толькі дасягаем адсеву і адбору буйных прымешак і ачысткі насеньня ад дробных прымешак. Трэба памятаць, што чым хутчэй праходзіць насеньне праз арфу, тым горш аддзяляюцца прымешкі. Пры арфаваньні трэба роўнамерна круціць ручку, каб быў аднэй сілы вецер. Пры працы арфа павінна быць добра ўмацавана, каб ня хісталася ў часе працы, што таксама адбіваецца на якасьці працы.

Другі мэтад ачысткі насеньня, гэта ачыстка яго трыерам. Трыерам насеньне па велічыні разьбіваецца на 4 разрады. У апошні разрад пападае самае дрэннае і дробнае насеньне з усімі прымешкамі і з насеньнем зельля. Віка ад аўса аддзяляецца праз сартоўку—зьмейку.

Насеньне ільну сартуецца на ільняных трашчотках. Для ачысткі ільнянога семя ад зельля, плюшкі, лён прапускаецца праз трыер, які мае спэцыяльныя цыліндры. За адну гадзіну такі ільняны трыер ачышчае каля 2-х цэнтнэраў сена ад плюшкі.

Кожная работніца калгасу, саўгасу павінна змагацца за 100 проц. ачыстку насеньня. Трэба памятаць, што чым лепшае будзе насеньне для пасеву, тым больш мы атрымаем ураджай

А.М.

Што зроблена па допісах

Ленкуток працуе

На заметку „Ленкуток занят работніцамі" партколектыў фабрыкі „Вэзуві" паведамляе, што бюро парткалектыву займалася гэтым пытаньнем і прапанавала вызваліць ленкуток.

Цяпер ленкуток вызвален і ў ім праводзіцца культмасавая работа.

Сартыроўка насеньня ў калгасе РККА.

Цана асобнага нумару 10 кап.

„РАБОТНІЦУ І КАЛГАСЬНІЦУ БЕЛАРУСІ“—У МАСЫ

Наш сустрэчны—2000

Клімавіцкі раён уключаецца ў конкурс па распаўсюджаньні часопісі, аб‘яўлены рэдакцыяй і Саюздрукам.

Складзен райштаб конкурсу, які бярэ на сябе наступныя абавязкі: На 1-І—32 году ў раёне выпісваецца—260 экз. **Райштаб высоўвае сустрэчную лічбу на працягу лютага месяца распаўсюдзіць па раёне 2.000 экз., з якіх ня менш 75 проц. гадавых і паўгадавых падпішчыкаў, на працягу сакавіка ахапіць падпіскай усіх пісьменных жанчын, работніц, калгасьніц,** бяднячак, **сераднячак-аднаасобніц.**

Выклікаем на сацспаборніцтва Касьцюковіцкі і Крычаўскі раёны на лепшае правядзеньне працы па распаўсюджаньні часопісі.

Райштаб.

Як мне дапамагла часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“

Я хварэла на брушны тыфус у цяжкай форме, пасьля чаго атрымала нэрвовую хваробу, якою хварэла 2 гады. Што я ні рабіла, у якіх дактароў ня была, колькі я выпіла лякарстваў, то нават страх падумаць, а здароўе маё ўсё падрывалася. Я ўжо была ўпэўнена, што ня вылечуся і чакала сьмерці. Але, дзякуючы нашай часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“ я даведалася, што нэрвовую хваробу можна вылечыць, толькі трэба лячыцца фізычным мэтадам і што ў Менску ёсьць інстытут фізычнага лячэньня. Даведаўшыся аб гэтым, я паехала ў Менск, пачала лячыцца і вылечылася.

Зараз я здаровая, хутка еду працаваць у калгас і на вучобу.

У адзнаку свайго ачуняньня я падпісалася на цэлы год на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ і даю абяцаньне, што, прыехаўшы ў калгас, правяду там падпіску сярод калгасьніц нашага сельсавету.

Шчыра дзякую часопісь за гэту вялізарную дапамогу, заклікаю ўсіх калгасьніц і аднаасобніц падпісацца на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“, чытаць яе, пісаць і распаўсюджваць.

Серафімава.

Калгасьніцы Асташкаўскага калгасу падпісаліся на часопісь

На агульным сходзе жанчын у Асташкаўскім калгасе, дзе стаяла пытаньне аб 6-ці ўмовах тав. Сталіна, была надзвычайная актыўнасьць. Выказваліся аб тым, што ў калгасе ёсьць факты абязьлічкі, ураўнілаўкі, няправільнага ўліку.

Калгасьніцы абяцалі ўпарта змагацца з гэтымі недахопамі. На сходзе прысутнічала больш чым 120 жанчын, якія аднагалосна ўхвалілі падпісацца на часопісь. 11 жанчын тут-жа ўнесьлі грошы на падпіску. Неабходна ўзмацніць культмасавую работу сярод жанчын гэтага калгасу.

Курас.

СТАРОНКА РУЧНОЙ ПРАЦЫ

Вярблюд. Аплікацыя (пашыўка кавалачкамі матар‘ялу) для фартушка ці ліфчыка. Сам вярблюд павінен быць пясочнага колеру, вузьдзечка чырвоная, накрывала белае з вышыўкай чорным і чырвоным.



Вішня. Вышыўка строчкай для дзіцячага фартушка.

Выданьне ЦК КП(б) Рэдактар Э. ШАПІРА.
Друкарня імя Сталіна Зак. № 228. 8.000 экз. Галоўлітбел № А—4